Голас Радзімы

15 чэрвеня 1978 г.
№ 24 (1542)

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ТАВАРЫСТВА ПА КУЛЬТУРНЫХ СУВЯЗЯХ З СУАЙЧЫННІКАМІ ЗА РУБЯЖОМ
(БЕЛАРУСКАЕ ТАВАРЫСТВА «РАДЗІМА»)

Год выдання 22-і
Цана 2 кап.

МАСТАК УЛАДЗІМІР БАСАЛЫГА: З дзяцінства мяне хвалявала і захапляла народнае мастацтва. Мо таму, што ўсе сваякі былі ўмельцамі — бабуля, цёткі, дзед — лепшы бондар на Случчыне, маці ткала. Скуль бярэцца ў іх тонкае, своеасаблівае пачуццё прыгажосці! Неаднойчы шукаў я для сябе адказ на гэтае пытанне. Простыя ж хлебаробы, вяскоўцы... І калі стаў прафесійным мастаком, галоўная тэма выявілася адразу — цудоўныя набыткі нашага народа. Адсюль і цікавасць да старадаўняга дойлідства. Падарожнічаючы па Беларусі, я бачыў шмат выдатных помнікаў. Яны цяпер ахоўваюцца дзяржавай, імі цікавяцца школьнікі і настаўнікі, пісьменнікі і журналісты... Працуючы над серыяй графічных работ «Помнікі дойлідства Беларусі», я ўзяў для цэнтральнай часткі трыпціха Мірскі замак. Ён нібы сімвал. Спакон веку наша зямля ляжала на дарозе ўсіх войнаў. Таму значная частка дойлідства мае абарончы характар. Нават цэрквы, замкі, жылыя дамы... Мой народ ніколі не нападаў, але абараняўся так, што ворагам не ставала месца на беларускай зямлі. А яе моц і прыгажосць заставалася і множылася рупнай працай нашых продкаў. Часцінку гэтай прыгажосці я і пастараўся адлюстраваць на паперы.



ВЫБАРШЧЫКІ ПРАПАНУЮЦЬ — ДЭПУТАТЫ АЖЫЦЦЯЎЛЯЮЦЬ

[«Выдатная традыцыя народаўладдзя»] стар. 2—3

САВЕЦКАЯ ЗНЕШНЯЯ ПАЛІТЫКА ЗАСТАЕЦЦА ВЕРНАЙ ЛЕНІНСКАМУ ЗАПАВЕТУ

[«Разоружение — идеал социализма»] стар. 4

«—РАДОК СТАЎ НЕЙЧАЙ РАДАСЦІ ВЫТОКАМ»

[«Жыцця сапраўдная цана»] стар. 7

ВЫДАТНАЯ ТРАДЫЦЫЯ НАРОДАЎЛАДДЗЯ

АБ ПРАКТЫЦЫ РАБОТЫ ОРГАНАЎ САВЕЦКАЙ УЛАДЫ З НАКАЗАМІ ВЫБАРШЧЫКАЎ У ГУТАРЦЫ З ЖУРНАЛІСТАМ В. ХАДАСОЎСКІМ РАСКАЗВАЕ СТАРШЫНЯ ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БЕЛАРУСКАЙ ССР Іван ПАЛЯКОЎ.

— Іван Яўцеевіч, як усякі выбаршчык, я ведаю, што ў нашай краіне існуе практыка наказаў кандыдатам у дэпутаты Саветаў — свайго роду дзелавых даручэнняў насельніцтва прадстаўнікам улады. Але вось упершыню гэта права грамадзян запісана ў новай Канстытуцыі СССР. Чым выклікана такое ўзмацненне ўвагі да наказаў выбаршчыкаў?

— Сапраўды, дзейнасць дэпутатаў нашых Саветаў заўсёды была падпарадкавана інтарэсам выбаршчыкаў. А іменна перадвыбарны наказ дае грамадзянам адну з непасрэдных магчымасцей паўплываць на сваіх паўнамоцных прадстаўнікоў, звярнуць увагу органаў улады на якія-небудзь набалелыя праблемы і паскорыць іх вырашэнне. Гэта выдатная традыцыя нашага народаўладдзя.

Каб адказаць на пытанне, прасочым, як змянялася сутнасць наказаў з часу ўзнікнення Саветаў да нашых дзён. Яшчэ ў тых выпадках, калі першыя Саветы ў Расіі не былі бальшавіцкімі, рабочыя і сяляне давалі наказы сваім дэпутатам адстойваць у іх рэвалюцыйную лінію, абараняць свае класавыя інтарэсы. Пасля перамогі сацыялістычнай рэвалюцыі змест наказаў змяніўся. У іх сталі адлюстроўвацца канкрэтныя сацыяльна-эканамічныя інтарэсы працоўных.

Мне давялося быць дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР пасля Вялікай Айчыннай вайны. Я памятаю наказы выбаршчыкаў у той нялёгкі час, калі ўсюды панавала разбурэнне і не хапала часам самага элементарнага. Праблем было шмат. Фашысты знішчылі ў рэспубліцы большую частку жылога фонду, і мільёны людзей туліліся ў зямлянках. Трэба было тэрмінова адбудоўваць гарады, наладжваць разбураную вытворчасць, праводзіць святло ў аддаленыя вёскі, адкрываць школы і дзіцячыя сады, якіх яшчэ не хапала...

Сёння ў нашай краіне пабудавана развітое сацыялістычнае грамадства. А гэта азначае карэнныя змены ва ўсіх сферах жыцця. Магутнай і развітай стала наша народная гаспадарка. Непараўнальна палепшыўся матэрыяльны дабрабыт насельніцтва. Вырас культурны ўзровень людзей. Удасканалілася за апошні час і дэмакратычная сістэма грамадства. Больш высокі статус атрымалі дэпутаты Саветаў усіх узроўняў. Змянілася выбарчая сістэма, знізіўся, у прыватнасці, узроставы цэнз для ўдзелу ў выбарах. Новыя дэмакратычныя правы набылі грамадскія арганізацыі. Прыняты цэлы шэраг пастаноў аб узмацненні ўвагі да пісьмаў, заяў і прапаноў працоўных у органы ўлады.

Увядзенне ў Асноўны Закон артыкула аб наказах мае тую ж мэту — надаць большае значэнне гэтаму важнаму дэмакратычнаму інстытуту, заканадаўча замацаваць гэтае права грамадзян. Дарэчы, артыкул 102 быў унесен у праект Канстытуцыі па прапанове саміх грамадзян у час яго ўсенароднага абмеркавання.

— Якія пажаданні цяпер часцей за ўсё трапляюцца ў наказах?

— Можна сказаць, што яны становяцца ўсё больш складанымі, важкімі, маштабнымі. Сёння ў наказах больш падымаецца праблем агульнадзяржаўнага значэння. Гэта пытанні арганізацыі вытворчасці, паляпшэння работы прамысловых прадпрыемстваў, калгасаў і саўгасаў, органаў аховы здароўя і культуры, добраўпарадкавання населеных пунктаў, аховы навакольнага асяроддзя.

Мне думаецца, што гэта звязана, з аднаго боку, з ростам грамадскай свядомасці, агульнай культуры і кругагляду людзей, а з другога — з ростам узроўню жыцця ў краіне. Людзей усё менш турбуюць дробныя бытавыя пытанні. Разам з тым кожны пераканаўся, што яго асабісты дабрабыт звязан з поспехамі фабрыкі, завода, калгаса ці ўстановы, дзе ён працуе. Таму кожны клапоціцца аб агульнай справе і інтарэсах усяго грамадства. Спацлюся на прыклады з дзейнасці Вярхоўнага Савета нашай рэспублікі.

У 1975 годзе Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР прыняў 437 наказаў дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР, 233 з іх ужо выкананы, астатнія ў стадыі вырашэння. Як і наказвалі выбаршчыкі, быў меліярыраван, напрыклад, буйны зямельны масіў у Зельвенскім раёне Гродзенскай вобласці, паскоран увод магутнасцей на

● ПАДЗЕІ ● ЛЮДЗІ ● ФАКТЫ ● ПАДЗЕІ ● ЛЮДЗІ ● ФАКТЫ ● ПАДЗЕІ ● ЛЮДЗІ ●

Надзея ОЛІНА працуе даяркай на Стрыганецкім малочнатаварным комплексе саўгаса «Беларусь» Жабінкаўскага раёна. Дзяўчыне падабаецца яе прафесія, бо работа на ферме ўсё больш падобна на працу індустрыяльнага рабочага. Надзея актыўна ўдзельнічае ў грамадскім жыцці вёскі. Яна — дэпутат абласнога Савета народных дэпутатаў, была дэлегатам XVIII з'езда ВЛКСМ.
НА ЗДЫМКУ: Н. ОЛІНА.

ЗА БРАТНЮЮ ДАПАМОГУ

В'етнамскі ордэн Дружбы ўручыў Беларускаму дзяржаўнаму універсітэту імя У. І. Леніна саветнік пасольства СРВ у СССР Нгуен Ба Таай. Высокай узнагародай адзначаны вялікі ўклад калектыву ў падрыхтоўку дыпламаваных спецыялістаў для народнай гаспадаркі брацкай краіны.

З 1962 года тут атрымалі вышэйшую адукацыю каля 300 в'етнамскіх юнакоў і дзяўчат. Яны сталі фізікамі, матэматыкамі, біёлагамі, хімікамі. Амаль тысяча пасланцоў В'етнама прайшлі навучанне на падрыхтоўчым аддзяленні універсітэта для паступлення ў іншыя вышэйшыя навучальныя ўстановы.

ПЕРШАЯ ПРАДУКЦЫЯ

Першыя 90 тон высакаякаснага дыэтычнага мяса адправіла ў гандлёвую сетку Гомельская бройлерная фабрыка. Да канца года новае прадпрыемства выпусціць 700 тон прадукцыі.

У строй дзеючых уведзена пакуль толькі першая чарга прадпрыемства. З дасягненнем поўнай праектнай магутнасці бройлерная фабрыка будзе выпускаць 4,6 тысячы тон мяса і больш за два мільёны штук яек у год.

Для рабочых прадпрыемства будуецца добраўпарадкаваны жылы пасёлак.

ПАЛАТКІ НАД НЁМАНАМ

Шмат гадоў назад берагі Нёмана паблізу вёскі Сялец Лідскага раёна гараджане аблюбавалі для адпачынку. Гэтым летам тут можна будзе добра правесці і водпуск.

За кіламетр ад Сяльца размясціўся добраўпарадкаваны палатачны гарадок. Да паслуг адпачываючых — двухмесныя і шматмесныя палаткі. Напракат — пасцельныя рэчы, прадметы культурна-бытавога ўжытку.

ДЛЯ ВЫВУЧЭННЯ ТЭХНІКІ ГДР

Амаль трэць агульнай колькасці сельскагаспадарчай тэхнікі, экспартуемай краінамі — членамі СЭУ ў нашу рэспубліку, паступае з ГДР.

Для навучання механізатараў рабоце на гэтых машынах створаны пункт на Заходняй машынавыпрабавальнай станцыі каля Мінска. Заняткі будуць праводзіць спецыялісты з ГДР.

7 чэрвеня ва ўрачыстай абстаноўцы адбылося адкрыццё вучэбна-кансультацыйнага пункта. На ім прысутнічалі віцэ-консул генеральнага консульства ГДР у Мінску Р. Штайн і дырэктар камбіната «Фортшрыт» па экспарту Г. Штэйдліх.

107-я ВЯСНА

Жыхарцы вёскі Чалюшчэвічы Петрыкаўскага раёна Аксеніі Ханчэўскай пайшоў 107-ы год. Нягледзячы на такі ўзрост, жанчына бадзёрая, рухавая, здаровая.

Замуж Аксенія Патапаўна выйшла ў семнаццаць год. Вырасціла пяцярых сыноў і дачок.

ПРАЦАВАЦЬ БУДЗЕ ЗРУЧНА

Узвядзенне жывёлагадоўчага комплексу па адкорму дванаццаці тысяч галоў буйной рагатай жывёлы ў год заканчваецца ў вёсцы Хоцень Клімавіцкага раёна. Устаноўленыя ў ім кормараздатчыкі, транспарцёры і іншыя механізмы аблегчаць умовы працы жывёлаводаў, павысяць яе прадукцыйнасць.



Магілёўскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга завод «Строммашына» вырабляе унікальныя па магутнасці прэсы, аўтаматызаваныя лініі і іншыя агрэгаты для будаўнічай індустрыі. Але прадпрыемства цікавае не толькі гэтым. Вялікую ўвагу тут надаюць азеляненню тэрыторыі, якая летам нагадвае буйны сад. Працаваць у цэхах накшталт тых, што вы бачыце на здымку, надзвычай прыемна.

● ПАДЗЕІ ● ЛЮДЗІ ● ФАКТЫ ● ПАДЗЕІ ● ЛЮДЗІ ● ФАКТЫ ● ПАДЗЕІ ● ЛЮДЗІ ●

АКАДЭМІК З ПАЛЕСКАЙ ВЁСКІ

У Беларускай Савецкай Энцыклапедыі пра вялікія заслугі вучонага-біёлага П. Ракіцкага гаворыцца так: «Сфармуляваў і эксперыментальна абгрунтаваў паняцце аб полі дзеяння гена. Упершыню ў СССР пачаў даследаванні па радыяцыйнай генетыцы млекакормячых...»

Імя Пятра Ракіцкага добра вядома ў навуковым свеце. Ганарацца ім і землякі-мазыране. Адна з вуліц пасёлка Крынічны названа яго імем. На тэрыторыі Палескай сельскагаспадарчай доследнай станцыі вырашана арганізаваць музей, экспанаты і матэрыялы якога будуць расказваць аб жыцці і дзейнасці акадэміка, аб развіцці біялагічнай навукі.

П. Ракіцкі нарадзіўся ў 1903 годзе ў вёсцы Кустаўніца Мазырскага раёна. Пасля заканчэння мясцовай гімназіі ён вучыўся ў Леменскай доследна-паказальнай школе-камуне, паблізу Чэрыкава. Здольнасці юнака заўважыў вопытны педагог М. Лепяшынскі, брат вядомага рэвалюцыянера-ленінца П. Лепяшынскага. Гэта і вырашыла лёс будучага вучонага.

Спачатку ён працаваў у сярэдняй школе, выкладаў батаніку, заалогію і часткова фізіку. Яшчэ юнаком П. Ракіцкі выявіў свой талент. Пад час вучобы ў Маскоўскім дзяржаўным універсітэце ён стаў супрацоўнічаць у Інстытуце эксперыментальнай біялогіі, прыняў удзел у калектыўнай рабоце па генетычнаму аналізу сукупнасці жывых арганізмаў.

У 28 гадоў П. Ракіцкі напісаў працу па біялогіі — першы савецкі падручнік для студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў. У 36 гадоў ён стаў доктарам біялагічных навук, прафесарам. Доўгі час працаваў загадчыкам кафедры біялогіі ў Беларускім дзяржаўным універсітэце імя У. І. Леніна.

А цяпер па-ранейшаму плённа працуе ў галіне матэматычных пытанняў генетыкі, вядзе пошукі ахоўных сродкаў супраць шкоднага ўздзеяння радыяцыі на спадчыннасць. Яму прысвоена званне заслужанага дзеяча навукі рэспублікі. Яго праца адзначана Дзяржаўнай прэміяй БССР, ордэнам «Знак Пашаны», медалямі.

Ю. ГЕРАСІМЕНКА.

ХІРУРГІЯ БЕЗ СКАЛЬПЕЛЯ

Першая ў краіне лабараторыя гемасорбцыі створана ў Мінску на базе новага медыцынскага комплексу 9-й клінічнай бальніцы. Яна ўваходзіць у адкрыты тут буйны гепаталагічны цэнтр хірургічнага профілю.

Загадчык лабараторыі, малады хірург У. Астапенка так перакладае яе назву: «Лабараторыя выдалення таксічных рэчываў непасрэдна з крыві па-за целам». Але чаму па-за целам? Уладзіслаў Аляксеевіч адчыняе дзверы са строгай шыльдай «Пастароннім уваход забаронены» — і бачыш апарат, які памерамі і формай нагадвае кніжную шафу. Па яго вертыкальнай панелі «рассыпаны» белыя, чырвоныя, зялёныя кнопкі, падобныя на гадзіннік-індыкатар, сталёвыя клямары для шкляных колбаў-калонак з актывіраваным вугалем. Гэтыя калонкі — галоўны вузел электроннай машыны, умоўна названай «штучная печань».

— Калонка з сарбентамі, гэта значыць паглынальнікамі таксічных рэчываў, выконвае тую ж ролю, што і ранец з фільтрамі ў процівагазе,—тлумачыць У. Астапенка.—Толькі замест паветра нашы фільтры ачышчаюць ад ядаў кроў. Ні адзін з існуючых метадаў выратавання чалавека ад атручвання не можа параўнацца з гемасорбцыяй па эфектыўнасці і хуткасці.

...Дзверы расчыніліся, і ў аперацыйную ўехала каталка. Прывезлі жанчыну ў вельмі цяжкім стане. Імгненна ажыла «штучная печань». Спрытным рухам хірургі падключылі да артэрыі і да вены хворай дзве злучаныя з апаратам трубкі. Аперацыя пачалася. Але не было тут звычайных атрыбутаў хірургіі. Па трубцы сапраўды па-за целам чалавека кроў палілася да фільтраў і, прайшоўшы праз іх, зноў вярталася ў арганізм, але ўжо ачышчаная ад таксінаў. Прайшло яшчэ

адным з вялікіх заводаў у Гомелі. У гэтым жа горадзе па прапановах насельніцтва пабудаван буйны шляхаправод, які прыкметна палепшыў работу гарадскога грамадскага транспарту.

Мінскія выбаршчыкі наказвалі вырашыць пытанне аб будаўніцтве ў Заводскім раёне сталіцы дзіцячай бальніцы і паліклінікі. Гэтыя ўстановы ўжо прымаюць пацыентаў.

Па наказах дэпутатаў пабудаваны таксама інтэрнат для рабочых Баранавіцкага завода станкапрыналежнасцей і жывёлагадоўчы комплекс на 600 кароў у Магілёўскай вобласці, уводзяцца Палац культуры на 1200 месц для рабочых шыннага камбіната ў Бабруйску і шмат іншых буйных аб'ектаў.

Не менш сур'ёзныя пытанні, звязаныя з рэалізацыяй наказаў выбаршчыкаў, вырашаюць мясцовыя Саветы. У 1975—1977 гадах у рэспубліцы, напрыклад, ажыццяўляючы наказы дэпутатаў мясцовых Саветаў, пабудавана 286 школ, 357 дзіцячых садоў, 255 медыцынскіх устаноў, сотні клубаў, бібліятэк, кінатэатраў, 636 магазінаў, 418 прадпрыемстваў бытавога абслугоўвання. Выканан вялікі аб'ём работ па добраўпарадкаванню гарадоў і вёсак, будаўніцтву жылля, дарог, мастоў, паляпшэнню водазабеспячэння і работы транспарту...

— Ці азначае гэта, Іван Яўцеевіч, што любая прапанова грамадзян на перадвыбарчай сустрэчы з кандыдатам у дэпутаты набывае сілу наказу?

— Гэта не так. Мы дамовіліся лічыць наказам толькі тую прапанову, якая мае грамадскае значэнне і адобрана большасцю прысутных пры сустрэчы. Ужо адно такое абмеркаванне праблем, якія выносяцца ў наказ, карысна. Яно выпрацоўвае ў людзей уменне думаць па-дзяржаўнаму.

Цікавы і далейшы шлях такіх прапаноў. Кожная з іх разглядаецца выканаўчым камітэтам адпаведнага Савета. Там вызначаюцца магчымыя шляхі іх ажыццяўлення і канкрэтныя выканаўцы. Тыя, у сваю чаргу, таксама выказваюць свае дзелавыя заўвагі: як лепш і хутчэй рэалізаваць наказ. І толькі потым на сесіі Савета наказ зацвярджаецца ўсімі дэпутатамі і прымае сілу закона для ўсіх выканаўцаў.

Як бачыце, парадак, з аднаго боку, дэмакратычны, а з другога — дзелавы: праекты, па якой-небудзь прычыне на сённяшні дзень нерэальныя, не прымаюцца.

— Ці не ўшчамляе такая працэдура права грамадзян звяртацца да прадстаўнікоў улады з любымі прапановамі?

— Любы грамадзянін можа звярнуцца ў любы орган улады або да дэпутата з любой прапановай. І ўсякую прапанову ўважліва разгледзяць і прымуць меры. Гэта закон дзейнасці Саветаў любога ўзроўню.

Асабліва ж статус наказаў мы падкрэсліваем не для таго, каб абмежаваць іх колькасць, а, наадварот, з мэтай канцэнтрацыі ўвагі і сродкаў на вырашэнне самых складаных праблем, падказаных насельніцтвам. Бо калі за такую прапанову прагаласуе Савет, ні адзін выканаўца не можа ўхіліцца ад удзелу ў яго рэалізацыі, нават спаслаўшыся на якія-небудзь аб'ектыўныя прычыны.

— Вы, Іван Яўцеевіч, згадалі пра сродкі. Адкуль жа бяруцца грошы на такое буйнамаштабнае будаўніцтва, не прадугледжанае загадзя дзяржаўным планам?

— Наказы не процістаяць плану, а хутчэй дапаўняюць яго, з'яўляючыся своеасаблівым барометрам патрэбнасцей насельніцтва. Яны дазваляюць больш дакладна фарміраваць планы, робяць іх больш дасканалымі. Калі выкананне наказу патрабуе вялікіх капіталаўкладанняў і іншых рэсурсаў, яго, па рашэнню Савета, уключаюць непасрэдна ў народнагаспадарчы план. Такім чынам у 1975—1977 гадах было выканана звыш 18 працэнтаў агульнай колькасці наказаў.

Але ёсць і іншыя шляхі адшукання рэсурсаў. Напрыклад, многія наказы рэалізуюцца кааперавaннем сродкаў прадпрыемстваў і арганізацый. Іменна так былі пабудаваны тая дзіцячая бальніца і паліклініка, аб якіх я гаварыў. А каштавалі яны каля 3,5 мільёна рублёў.

Даюць грошы на ажыццяўленне наказаў і самі Саветы за кошт перавыканання даходнай часткі сваіх бюджэтаў. Ды і сіламі грамадскасці, як мы пераканаліся, можна зрабіць нямала.

— А хто адказвае за выкананне наказу?

— Перш за ўсё, сам дэпутат. Ён, зразумела, не можа сам пабудаваць, скажам, школу, але мае права запатрабаваць справаздачу аб ходзе работ у любой арганізацыі і кіраўніцтва аж да міністраў. Калі ж дэпутат нядбала паставіцца да выканання ўзятых ім абавязацельстваў, выбаршчыкі маюць права адазваць яго з Савета. Кантралююць выкананне наказаў і пастаянныя дэпутацкія камісіі, якія існуюць у Саветах па ўсіх галінах народнай гаспадаркі.

— Вернемся, Іван Яўцеевіч, да пачатку нашай размовы. Якія практычныя вынікі будзе мець увядзенне ў Канстытуцыю артыкула аб наказах?

— Для выканання гэтага артыкула будзе распрацаваны закон аб парадку разгляду і выканання наказаў. Праект такога заканадаўчага акта падрыхтоўваецца і ў Беларусі. Гэты дакумент дасць новыя магчымасці Саветам, дазволіць праводзіць работу з наказамі больш планамерна, забяспечыць удзел у ёй усіх дзяржаўных і грамадскіх арганізацый.

крыху часу, і небяспека мінула, жыццё хворай выратавана.

— Пры самым вострым, нават у смяртэльных дозах, атручванні пасля нашай амаль бяскроўнай аперацыі чалавек праз тыдзень ідзе дадому здаровым, — тлумачыць У. Астапенка. — Некалькі інакш бывае пры цырозах печані і механічнай жаўтусе, калі камні або пухліна закупорваюць пратокі. Тут, натуральна, неабходна складаная аперацыя. Але без нашай, папярэдняй, слабыя хворыя могуць яе не вытрымаць. Гемасорбцыя вяртае ім сілы, і хірургі з найменшай рызыкай для пацыента вядуць далейшую барацьбу за яго жыццё і здароўе.

Е. ПАЛУШКІНА.

ОРДЭН ІНСТЫТУТУ

Беларускі навукова-даследчы інстытут земляробства, які адзначыў нядаўна сваё 50-годдзе, уносіць вялікі ўклад у справу інтэнсіфікацыі і павышэння эканамічнай эфектыўнасці сельскагаспадарчай вытворчасці. Ён стаў буйным навуковым цэнтрам арганізацыі земляробства, селекцыі і тэхналогіі вырошчвання збожжавых, зернебабовых і крупяных культур, кармавых караняплодаў, шматгадовых траў, ільну і цукровых буракоў.

Толькі за апошнія сем гадоў раяніравана 14 сартоў, выведзеных у інстытуце, і цяпер праходзяць выпрабаванне яшчэ 23. Звыш мільёна гектараў заняло ў нашай і іншых рэспубліках азімае жыта «белта», на вялікай плошчы вырошчваецца лён «аршанскі-2». Даследаваны і дадзены тэарэтычныя абгрунтаванні заканамернасцей фарміравання высокіх ураджаяў сельскагаспадарчых культур, распрацоўваюцца праблемы прамысловай вытворчасці прадукцыі раслінаводства ва ўмовах паглыбленай спецыялізацыі і канцэнтрацыі прымяняльна да розных глебава-кліматычных зон рэспублікі.

За заслугі ў развіцці сельскагаспадарчай навукі, стварэнне новых сартоў збожжавых і зернебабовых культур і ўкараненне дасягненняў навукі ў вытворчасць інстытут узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

БУДЗЕ ЛЁН ЗАЛАТЫМ

Звітыя ў акуратныя васьмёркі, між лістоў «кнігі» ляжалі пушыстыя пасмачкі льнянога валакна. Кожны новы ўзор ураджаў незвычайнасцю расфарбоўкі. Усе адценні залацістага, зялёнага і амаль белага колеру ніяк не стасаваліся з прывычнымі ўяўленнямі аб ільняных валокнах. Заўсёды яны былі шэрымі, і раптам такая вясёлка! Аднак фарбавальнікі, як высветлілася, тут былі ні пры чым.

— Мы атрымалі валакно натуральнага колеру — сказаў загадчык лабараторыі Інстытута мікрабіялогіі АН БССР, кандыдат тэхнічных навук І. Стахееў. — Шэрым валакно рабілі мікраарганізмы за доўгія месяцы, праведзеныя на сцелішчах. Яны перафарбоўвалі яго і за час паскоранага, амаль стогадзіннага паспявання ў заводскіх умовах. Прапанаваная намі тэхналогія дазваляе скараціць час на апрацоўку льнотрасты да сутак, а ў некаторых выпадках да шасці гадзін. Валакно застаецца такім жа залаціста-жоўтым, як і ў жывой расліне.

Няпроста аддае сцябло сваё валакно. З усіх бакоў яго трывалыя ніці акружаны мяккай злучальнай тканкай, ад якой і неабходна пазбавіцца. Гэта робяць мікробы. Валокны для іх — нялёгкая здабыча, і таму яны разбураюць у першую чаргу злучальную тканку. Але працэс гэты некіруемы. Сцябло «атакуюць» розныя мікраарганізмы. Некаторыя з іх наносяць больш шкоды, чым карысці.

Шматлікія спробы вучоных розных краін прыцягнуць на дапамогу хімію не мелі поспеху. Усе прапанаваныя спосабы былі дарагімі або псавалі валакно. А што, калі выкарыстаць «зброю» мікраарганізмаў — ферменты, але адабраць лепшыя з іх, якія б, не пашкоджваючы валокны, хутка разбуралі злучальную тканку?

Пасля некалькіх год эксперыментаў з дзвюма сотнямі відаў мікраскапічных грыбоў былі адабраны шэсць, якія выдзяляюць ферменты строга накіраванага дзеяння. Атрыманы з іх прэпарат дазваляе за некалькі гадзін рабіць тое, на што прырода траціць месяцы.

Д. ПАТЫКА.

сельскія навіны

КАЛГАСНАЯ ПЕРСАНАЛЬНАЯ

«Лічыць персанальнымі пенсіянерамі калгаса заслужаных ветэранаў працы Навума Борматава, Фёдара Саўчанку і Ксенію Борматаву». Такі запіс з'явіўся ў пратаколе сумеснага пасяджэння партбюро, мясцкома і праўлення калгаса «Ленінскі шлях» Мсціслаўскага раёна.

Персанальная пенсія калгаса вышэйшая за звычайную. Яна дае права на бясплатныя пуцёўкі ў санаторыі і дамы адпачынку, зніжэнне аплаты, а ў шэрагу выпадкаў і адмену яе за карыстанне радыёкропкай, электрычнасцю, калгасным аўтатранспартам.

ПАМЯТНЫ ВЕЧАР

Надоўга запомніцца гэты вечар даярцы Лідзіі Антонік, шафёру Уладзіміру Шпаку і трактарысту Пятру Навіцкаму — перадавікам сельскагаспадарчай вытворчасці калгаса імя Суворава Слонімскага раёна. Іх запрасілі на сцэну снітоўскага сельскага Дома культуры, каб пры ўсім народзе павіншаваць з выдатнымі дасягненнямі ў працы. «Віноўнікам» свята ўручылі букеты кветак. Затым па іх заяўках самадзейныя артысты выканалі песні, танцавальныя нумары.

Дарэчы, калгасны калектыў мастацкай самадзейнасці — адзін з лепшых у раёне. Яго ўдзельнікі нядаўна ажыццявілі пастаноўку спектакля «Прымакі» па п'есе Янкі Купалы. Галоўныя ролі ў ім выканалі шафёр Васіль Лысуха, электрык Фёдар Лысы, інструктар па спорту Людміла Хмыз, паляводкі Наталля Пякарская і Соф'я Данілюк.

ВУЧОНЫЯ З ТРАКЕЛЬ

У доме рабочага саўгаса «Тракельскі» Міхаіла Грыневіча ўрачыстасць: сын Юльян паспяхова закончыў аспірантуру і атрымаў вучоную ступень. Гэта ўжо другі кандыдат навук у сям'і Грыневічаў. Яшчэ раней старэйшы сын Аляксандр паспяхова вытрымаў экзамен і стаў кандыдатам сельскагаспадарчых навук.

Усё сваё жыццё Міхаіл Браніслававіч разам з жонкай працавалі ў сельскай гаспадарцы. У гады юнацтва яны не маглі атрымаць адпаведную адукацыю — не да вучобы было, працавалі на панскіх палях. Калі на тэрыторыі Заходняй Беларусі ўстанавілася Савецкая ўлада, Міхаіл Грыневіч быў першым сельскім актывістам, дэпутатам абласнога, раённага Саветаў народных дэпутатаў, каля трох год узначальваў мясцовы калгас «1 Мая».

Інакш складваўся лёс дзяцей Грыневічаў. Сын Юльян паступіў у Мінскі інстытут механізацыі і электрыфікацыі сельскай гаспадаркі і паспяхова закончыў яго, потым атрымаў вышэйшую адукацыю і другі сын Аляксандр.

Сёння ў саўгасе «Тракельскі» амаль у кожнай другой сям'і ёсць спецыяліст з вышэйшай або сярэдняй спецыяльнай адукацыяй. Напрыклад, у сям'і электрыка Станіслава Бяляўскага сын стаў кандыдатам матэматычных навук. Абараніў дысертацыю і выпускнік Тракельскай сярэдняй школы Станіслаў Сарэла. Цяпер ён працуе выкладчыкам у Гомельскім універсітэце.

Многія сяльчане, атрымаўшы вышэйшую адукацыю, узначальваюць адказныя ўчасткі ў роднай гаспадарцы, калгасах і саўгасах раёна. Напрыклад, Л. Вільбік працуе старшынёй калгаса «Радунскі».

Тракельская школа зрабіла 20 выпускаў. З яе класаў на самастойную жыццёвую дарогу выйшла каля 300 юнакоў і дзяўчат. Больш як палавіна з іх сталі аграномамі, настаўнікамі, інжынерамі, урачамі, высакакласнымі спецыялістамі і рабочымі.



Недалёка ад Мінска, у вёсцы Блонь, з'явілася унікальнае для вёскі збудаванне. Гэта кааперавaнае прадпрыемства службы быту, у якое ўваходзяць комплексна-прыёмны пункт, лазня і пральня самаабслугоўвання. Комплекс быту — лепшае па сваіх маштабах, ступені механізацыі і аўтаматызацыі тэхналагічных працэсаў, а таксама па прыгажосці афармлення прадпрыемства бытавога абслугоўвання, пабудаванае ў сельскай мясцовасці. Тут жыхары змогуць заказаць сабе адзенне. Прадпрыемства рамантуе халадзільнікі, пылососы і многія іншыя бытавыя прыборы.

НА ЗДЫМКАХ: комплекс быту; у пральні самаабслугоўвання.

Фота М. МІНКОВІЧА.

«ЗАСТАВАЙЦЕСЯ ЗАЎСЁДЫ МІЛЫМІ, ДОБРЫМІ, ЧУЛЫМІ!»

Не мінаюць Беларусь замежныя падарожнікі і сёння, у апошнюю чвэрць XX стагоддзя. Кагосьці тут чакаюць справы — дыпламатаў, вучоных, спецыялістаў... Некаторыя — асабліва нашы зарубежныя суайчыннікі — едуць па прыватных візах наведаць родных, блізкіх, знаёмых. Але большасць іншаземных гасцей — турысты.

Яны ляцяць самалётамі, прыбываюць паяздамі, на аўтобусах і ўласных аўтамабілях, групамі і індывідуальна. І толькі летась, напрыклад, у нашай рэспубліцы пабывалі турысты больш як з 60 краін свету. Так што мінчане прывыклі чуць на вуліцах свайго горада, асабліва ўлетку, замежную мову, іх не здзіўляюць іншаземцы, апранутыя ў каларытнае нацыянальнае адзенне.

Фірма Інтурыст прапануе замежным гасцям маршруты, якія ўключаюць 135 гарадоў, у тым ліку і беларускія — Мінск і Брэст. І ў кожным іх чакаюць камфартабельныя сучасныя гасцініцы: «Інтурыст» у Брэсце, і «Юбілейная» ў сталіцы Беларусі. Вось як гаварыў пра апошнюю наш зямляк са Злучаных Штатаў Амерыкі Рыгор Мехаў, які наведаў Мінск у 1971 годзе: «Сярод найбольш значных збудаванняў, што з'явіліся ў Мінску за апошнія гады, — Палац спорту і гасцініца «Юбілейная», дзе мы жылі амаль цэлы тыдзень. Размешчана яна на Парказвай магістралі, побач працякае Свіслач, а навокал столькі зеляніны! Ад гэтага паветра ў нумарах — утульных і зручных — чыстае, жыватворнае...»

Трынаццаціпавярховы будынак гасцініцы, у якім увасоблены сучасныя тэндэнцыі архітэктуры (аўтары праекта Г. Бенядзіктаў і У. Начараў), з'явіўся ў Мінску ў 1968 годзе. Ён арганічна ўпісаўся ў «запаведныя зоны», што захаваліся ў раёне вуліцы Астроўскага і плошчы Свабоды. Тут, у сутоку рэк Свіслачы і Нямігі, у другой палавіне XI стагоддзя было замчышча — ядро старажытнага Менска. І сёння непадалёк ад гасцініцы «Юбілейная» — музеі, тэатры і кінатэатры, магазіны, спартыўныя пляцоўкі — цэнтр горада. Гэта, так сказаць, навакольнае асяроддзе. Сама ж гасцініца — «будынак са спецыялізаванымі памяшканнямі для часовага пражывання прыезджых», як вызначае энцыклапедыя.

Звыш чатырохсот чалавек могуць адначасова размясціцца ў двухстах сарака дзевяці нумарах «Юбілейнай». Гэтыя лічбы паведаміла мне ў гутарцы намеснік дырэктара гасцініцы Кацярына Сенкавец.

— З іх, — працягвала яна, — дзесяць люксаў, восемдзесят пяць аднамесных і 154 двухмесныя. У люксе — два пакоі з прыгожай сучаснай мэбляй. Ёсць ванна, каляровы тэлевізар, халадзільнік, тэлефон. У адна- і двухмесныя можна ўзяць напракат тэлевізар і халадзільнік. Каштуе гэта капейкі.

— А які ж кошт саміх нумароў?

— Замежныя турысты плацяць за люкс 17 рублёў, за аднамесны — 11, а за двухмесны — па 7 рублёў.

Трэба сказаць, што цэны ў «Юбілейнай» значна ніжэйшыя, чым, скажам, у гасцініцах такога класа дзе-небудзь у Вялікабрытаніі, Злучаных Штатах Амерыкі або Канадзе. Перада мной ляжыць прэйскурант адной лонданскай гасцініцы, значна ніжэйшай катэгорыі, чым «Юбілейная». Там я спыняўся ў час сёлетняга падарожжа па Англіі. Яе нумары каштуюць амаль у два разы вышэй, чым у адным з лепшых мінскіх атэляў. Але вас, паважаны чытач, напэўна, цікавяць не толькі лічбы. Што ж, давайце зойдзем у гасцініцу.

Ля ўваходу вас сустракае... ну, вядома ж, швейцар. Ад яго знешняга выгляду, тактоўнасці залежыць многае, і перш за ўсё ваш настрой. Тут, у «Юбілейнай» вам яго не сапсуюць. Уважлівыя парцье хутка афармяць неабходныя паперы і выдадуць ключ — калі ласка, адпачывайце. Для гэтага ў «Юбілейнай» створаны ўсе ўмовы: светлыя, утульныя нумары, прасторныя холы. Арыгінальна вырашаны інтэр'еры, у стварэнні якіх прымалі ўдзел вядомыя беларускія мастакі Данцыг, Зубараў, Гаўрылаў і іншыя. Для мастацкага аздаблення гасцініцы выкарыстоўваліся каштоўныя пароды дрэва, шкло, метал, кераміка. Знешні выгляд холаў пастаянна ўдасканальваецца. У час майго апошняга наведвання я бачыў, як рабочыя мянялі вялізныя слайды, што ўстаноўлены на кожным паверсе. У холах, побач са слайдамі — своеасаблівыя «вітрыны», дзе выстаўлены ўзоры сувеніраў, якія можна набыць у кіёску «Бярозка», што знаходзіцца ў вестыбюлі гасцініцы.

Тут жа, на першым паверсе, размясціліся бюро абслугоўвання, бюро па абмену валюты, кіёск, дзе прадаюцца газеты і часопісы, у тым ліку і зарубежныя. І несумненна тое, як арганізаваны дадатковыя паслугі, у значнай меры характарызуе культуру абслугоўвання.

Работнікі бюро абслугоўвання афармяць вам заказ на аўтамабіль (служба аўтасэрвісу гасцініцы налічвае звыш двух дзесяткаў аўтамашын), арганізуюць білеты ў тэатр, кіно, цырк, афармяць білеты на самалёт, на поезд. За тры гадзіны карыстання аўтамашынай неабходна заплаціць 19 рублёў, кожная гадзіна звыш гэтай нормы — 5 рублёў. За адзін рубель вы можаце наведаць «сауну», якая размешчана ў гасцініцы. Дастаўка кветак, сувеніраў, іншых пакупак абыдзецца вам усяго ў 30 капеек, лякарстваў — 10 капеек. За дадатковую аплату тут арганізуюць пераклад тэкстаў.

Але ж настрой падарожніка ў значнай ступені залежыць не толькі ад гасціннасці гаспадароў. Важна яшчэ і тое, чым і як яго пачаставалі. У рэстаране гасцініцы «Юбілейнай», які разлічаны на 450 месц, вам прапануюць стравы беларускай, старадаўняй рускай і еўрапейскай кухань. Гэта і славуты беларускі боршч, і мачанка з блінамі, і дранікі бульбяныя са шкваркамі, і грыбы ў смятане... Тут вы можаце паспытаць і фірменныя напіткі рэстарана, выпіць кілішак-другі «Белавежскай» гарэлкі, беларускага бальзаму. А ў бары вопытны бармен зробіць менавіта той кактэйль, які вы прывыклі смакаваць у сябе дома або ў любімым кафэ дзе-небудзь у Манро, Бірмінгеме або ў Гамбургу.

— Яшчэ неабходна адзначыць, — расказвае Кацярына Сенкавец, — што на базе нашай гасцініцы праводзяцца прыёмы і абслугоўванне міжнародных мерапрыемстваў, тут часта размяшчаюцца ўрадавыя дэлегацыі, удзельнікі міжнародных чэмпіянатаў. У канцы мая, напрыклад, у канферэнц-зале «Юбілейнай» працаваў VIII кангрэс Міжнароднай федэрацыі барацьбітоў Супраціўлення. Яго ўдзельнікі жылі ў нашай гасцініцы і засталіся вельмі задаволенымі. Нават пакінулі запіс у кнізе водгукаў.

Гэтую кнігу я ўжо бачыў раней. Менавіта там і знайшоў запіс Рыгора Мехава. А побач былі шматлікія водгукі іншых зарубежных турыстаў.

«Нас тут вельмі добра прымалі. Усім задаволены: гасцініцай, рэстаранам.

Група «Орбіс» з Польшчы».

«Група турыстаў з Фінляндыі жыла ў гасцініцы «Юбілейная» ў сакавіку 1978 года. Засталіся вельмі задаволены ўмовамі, створанымі для нас. У такой гасцініцы можна жыць месяцамі. А ў такім горадзе, як Мінск, — хоць усё жыццё».

А турысты з Лацінскай Амерыкі запісалі:

«Дзякуем за ўсё: за цудоўныя нумары, за добрае харчаванне, за шчырую ўвагу да нас. Няма слоў, каб перадаць радасць ад сустрэч з добразычлівымі, уважлівымі людзьмі — супрацоўнікамі гасцініцы. Заставайцеся заўсёды такімі мілымі, добрымі і чулымі!»

Уладзімір МЯЛЕШКА.

Гасцініца «Інтурыст» у Брэсце.

РАЗОРУЖЕНИЕ — ИДЕАЛ СОЦИАЛИЗМА

ЛЕНИНСКИЙ ПЛАН ВСЕОБЩЕГО РАЗОРУЖЕНИЯ

ПОДХОДИЛА к концу трудная снежная зима 1921—1922 годов. Молодая Страна Советов, только что вырвавшаяся из огненного кольца фронтов гражданской войны, отчаянно напрягала силы в борьбе с разрухой и голодом. И в это самое время революционная Россия готовилась выступить на созывавшейся в старинном итальянском городе Генуе международной экономической конференции с широкой программой мирного хозяйственного сотрудничества и разоружения. Ленин, Советское правительство обращались ко всем народам земного шара, потерявшим в недавно закончившейся первой мировой войне 10 миллионов убитыми и 10 миллионов погибшими от голода и эпидемий, с призывом жить в мире и согласии, без оружия и войн!

В ту мартовскую ночь 1922 года в Москве в кабинете наркома (министра) иностранных дел Георгия Чичерина на до утра горел свет. Ему обязательно нужно было закончить очень важное письмо, которое завтра прочитает Ленин. Письмо с проектом советских предложений на Генуэзской конференции. Сначала даже такому блестящему и гибкому дипломату, как Чичерин, был не вполне ясен стратегический замысел вождя революции. Выдвинуть в Генуе предложение о разоружении? Но ведь не кто иной, как Ленин, безжалостно критиковал лозунг разоружения, выдвинутый в годы первой мировой войны Каутским и другими оппортунистическими вождями II Интернационала. Критиковал за мещанский пацифизм, за трусливую подмену боевого призыва к классовым боям пролетариата с буржуазией бессильными вздохами о пользе разоружения и отказа от постоянных армий. И теперь тот же Ленин предлагал Чичерину разработать широчайшую мирную программу. Это казалось непостижимым!

Однако великий мастер революционной диалектики, каким был Ленин, судил иначе. Да, разоружение как программа революционной марксистской партии, да еще накануне решающих классовых битв, — это абсурд, вредная иллюзия, оппортунизм. Так ставил Ленин вопрос в 1916 году. Но после победы социалистической революции в России в обстановке становления мирного сосуществования государств с различным социальным строем, в условиях, когда бремя вооружения все сильнее давило на плечи трудящихся, когда даже среди самой буржуазии все чаще раздавались здравые голоса в пользу мира,—в этих новых условиях лозунг разоружения приобретал уже совершенно иной смысл. Ведь в той же самой ленинской статье «О лозунге разоружения» были и такие поистине замечательные строки: «Разоружение есть идеал социализма. В социалистическом обществе не будет войн, следовательно, осуществится разоружение». Конечно, не все зависит от желания коммунистов — и Ленин как реальный политик не мог не сознавать этого, вполне допуская мысль о возможности отказа империалистов от предложений Советской России. Но Ленин знал и другое: в политике путь к достижению поставленной цели бывает порой долгим и трудным, и все же нужно когда-то делать первый шаг и выдвигать даже фантастические на первый взгляд планы, если ты уверен в их конечном торжестве, в их совпадении с заветными чаяниями миллионов простых людей на земле. А в этом Ленин не сомневался ни минуты. Вот почему он предложил Чичерину соединить в Генуе предложения о самом широком и всестороннем экономическом сотрудничестве всех государств и народов, которое могло бы в кратчайший срок преодолеть послевоенную разруху, с программой разоружения, которая не только гарантировала бы прочный мир, но и высвободила бы значительные материальные средства на созидательный труд всего человечества.

И вот Генуя с ее дворцами и виллами, город моряков и музыкантов. 10 апреля 1922 года. Дворец Сан-Джорджио. Места в знаменитом «Зале сделок» занимают представители 34 государств. Первоначально главой советской делегации был утвержден Ленин, поскольку он руководил всей предварительной работой по подготовке к конференции. Однако состояние здоровья Ленина заставило Советское правительство передать функции главы делегации Георгию Чичерину, который и огласил на конференции предложения молодой Страны Советов.

В его блестящей речи, которую он сам же немедленно переводил на французский и английский языки, был и раздел о всеобщем и полном разоружении. «Российская делегация, — говорил Чичерин, — намерена в течение дальнейших работ конференции предложить всеобщее сокращение вооружений и поддержать все предложения, имеющие целью облегчить бремя милитаризма, при условии сокращения армий всех государств и дополнения правил войны полным запрещением ее наиболее варварских форм, как ядовитых газов, воздушной войны и других, в особенности же применения средств разрушения, направленных против мирного населения.

Само собой разумеется, что Россия со своей стороны готова также провести сокращение вооружений и для себя при условии полной и безоговорочной взаимности и создания для нее необходимых гарантий от каких бы то ни было нападений и вмешательства в ее внутренние дела».

По залу как будто пробежал электрический ток. Такого здесь еще не слышали. Оживленно переговаривались видавшие виды дипломаты, гудел балкон для журналистов, среди которых был и никому еще не известный тогда Эрнест Хемингуэй. Однако представители стран Антанты немедленно дали понять, что они не допустят обсуждения на конференции советского предложения, которое выходило якобы за рамки ее программы. Обсуждение советской инициативы в Генуе было сорвано.

Однако мировое общественное мнение сразу же по достоинству оценило искренность и благородство советской позиции.

Несмотря на отказ западных держав обсуждать советские предложения о разоружении, Советская Россия в одностороннем порядке сократила к середине 1922 года численность своих вооруженных сил более чем в 6 раз и довела их до 800 тысяч человек. В конце того же 1922 года Советская страна обратилась с предложением о значительном сокращении вооружений к правительствам ряда западных сопредельных государств. Однако и они оказались в тот момент неготовыми к конструктивному решению этой проблемы. Целый ряд предложений о разоружении СССР делал и в последующие годы.

Сегодня советская дипломатия, руководствуясь ленинскими принципами мирного сосуществования, продолжает настойчивые поиски решения этой жизненно важной проблемы. И очень знаменательно, что, как и 50 с лишним лет назад в Генуе, Советский Союз связывает проблему разоружения с развитием экономического сотрудничества между народами. Достаточно напомнить о том, что в 1973 году XXVIII сессия Генеральной Ассамблеи ООН приняла по предложению СССР резолюцию «О сокращении военных бюджетов государств — постоянных членов Совета Безопасности на 10 процентов и об использовании части сэкономленных средств на оказание помощи развивающимся странам». Таким образом, советская внешняя политика остается верной ленинскому завету: разоружение и экономическое сотрудничество всех стран во имя прогресса и мира на земле.

Станислав ТЮТЮКИН,
кандидат исторических наук,
АПН.

Д. ЛЬЮІС і Д. ЭЙН на мітынгу ў Свіслачы 9 мая 1978 г.

У РОДНЫМ КРАІ

Дэвід Льюіс і Джон Эйн не былі ў месцах, дзе нарадзіліся, доўгія гады. Аднойчы ў Канадзе прачыталі пра сваё роднае мястэчка Свіслач. Ускалыхнуліся ўспаміны, успыхнула жаданне ўбачыць уласнымі вачыма перамены, пра якія пісалася ў артыкуле. Прыехаўшы ў СССР турыстамі, землякі атрымалі магчымасць змяніць маршрут і наведаць Свіслач.

Д. Льюіс пакінуў Радзіму з бацькамі ў 1921 годзе, калі пасля грамадзянскай вайны ў заходніх абласцях устанавілася панаванне буржуазна-памешчыцкай Польшчы. У Канадзе Дэвід атрымаў адукацыю, займаўся палітыкай, выдаваў газету. Зараз ён прафесар універсітэта ў Атаве.

Д. Эйн выехаў са Свіслачы ў гады сусветнага прамысловага крызісу — у 1930 годзе. У Канадзе вучыўся, працаваў. Ён прэзідэнт буйной будаўнічай фірмы, член праўлення адной з прыватных бальніц.

Ад даўнейшага гарадка мала што засталося. Госці з цяжкасцю пазнавалі абрысы вуліц і стары гарадскі парк. А ў цэнтры пасёлка, дзе некалі была заўсёды шумная і брудная базарная плошча, — цяпер зялёны сквер, Дом культуры.

У выканкоме раённага Савета народных дэпутатаў старшыня выканкома, дэпутат Вярхоўнага Савета Беларускай ССР Настасся Цагельнік (дарэчы, сама родам з гэтых жа мясцін, з сялянскай сям'і, вёскі Занкі, што за кіламетр ад Свіслачы) падрабязна расказала ім аб Свіслачы, аб зменах і планах на будучае, аб умовах, якія створаны для жыцця, працы, адпачынку яе жыхароў. Госці пабывалі ў сярэдняй школе і школе-інтэрнаце, у раённай бальніцы, усклалі кветкі на месцы расстрэлу гітлераўцамі больш як пяці тысяч савецкіх грамадзян у першыя ж дні акупацыі.

Захапленне гасцей выклікала раённая бальніца, на будаўніцтва якой было адпушчана паўтара мільёна рублёў. Госці не ўтойвалі свайго здзіўлення, бачачы сучаснае абсталяванне, чысціню і парадак. Асаблівую цікавасць праяўляў містэр Эйн. Ён успомніў эпізод далёкага дзяцінства, калі ён разбіў галаву і аперацыю адзін з двух прыватных урачоў рабіў яму на звычайным стале. А цяпер у бальніцы працуе больш за пяцьдзесят урачоў з вышэйшай адукацыяй. І абсталявана яна па-сучаснаму.

Госці наведалі Свіслач у Дзень Перамогі, калі яе вуліцы і дамы былі ў святочным убранні, яны змаглі прыняць удзел у масавым гулянні, пабыць на агульнагарадскім мітынгу.

— Мы ўражаны ўсім убачаным, — сказалі Д. Льюіс і Д. Эйн. — Мы не чакалі гэтага. Усяго вам самага найлепшага! Мы ўдзячны за гасціннасць, добразычлівасць. Удзячны за ўсё, што нам паказалі і расказалі.

Мы хочам, каб усе людзі на зямлі жылі мірна і шчасліва, а для гэтага трэба шырэй знаёміцца з жыццём іншых народаў, больш ведаць пра іх.

А. ПАЛУБІНСКІ,
А. СМАЛЬЯНАЎ.

за мяжой і дома

ПРАДСТАЎЛЯЮЦЬ ЧЭШСКІЯ ФАРМАЦЭЎТЫ

10—16 чэрвеня ў Гандлёва-прамысловай палаце БССР праходзіла выстаўка «Лякарствы ЧССР». Яе арганізавала акцыянернае таварыства па экспарту і імпарту хімікафармацэўтычных вырабаў «Хемапол» з Прагі — адно з двух чэхаславацкіх таварыстваў па імпарту і экспарту хімічных і фармацэўтычных тавараў і сыравіны.

Экспазіцыя выстаўкі складалася з некалькіх раздзелаў. У першым з іх дэманстраваліся сродкі для медыкаментознага лячэння. Наведвальнікі ўбачылі тут каля 80 прэпаратаў, якія Чэхаславакія на працягу некалькіх год пастаўляе ўжо ў СССР або будзе экспартаваць у бліжэйшы час.

Раздзел, прысвечаны лякарствам і імуннабіялагічным прэпаратам, прызначаным для ветэрынарнай службы і заатэхніі, складаўся з прадукцыі фармацэўтычных прадпрыемстваў «СПОФА» і заводаў спецыялізаванага нацыянальнага прадпрыемства «БІЯВЕТА».

У секцыі «Дыягностыка» экспанаваліся імуннабіялагічныя дыягнастычныя прэпараты і наборы дыягнастычных хімікаліяў для экспрэс-дыягназаў. Асаблівую цікавасць выклікалі экспанаты стаматалагічнага раздзелу выстаўкі, дзе былі прадстаўлены разнастайныя сродкі пратэзавання, лячэння і прафілактыкі зубных захворванняў, вырабляемыя фірмай «СПОФА-Дзентал».

Сёлетняя выстаўка ў Мінску — 50-я ў СССР, якую правяло за пасляваенныя гады акцыянернае таварыства «Хемапол». Толькі за апошняе дзесяцігоддзе аб'ём экспарту чэхаславацкіх лякарстваў у СССР падвоіўся.

«Голас Радзімы»
№ 24 (1542), 1978 г.

Валянцін Грыцкевіч,
Адам Мальдзіс

ЕХАЛІ ПРАЗ БЕЛАРУСЬ ПАДАРОЖНІКІ

[Працяг. Пачатак у № 23.]

Вясной і восенню станавіліся непраезджымі нават славутыя «кацярынінскія шляхі». Гэта засведчылі англічанін Б. Пінкертон і рускі Б. Цалінскі. На найбольш забалочаных участках, асабліва на Палессі, трэба было рэгулярна папраўляць доўгія грэблі. Яны апісаны і нават замаляваны ў альбомах эльзаскага мастака І. Мюнца. У 1783 годзе ён сам пераканаўся, што пераходы па палескіх грэблях «цяжкія для людзей і для жывёлы, але інакш нельга рухацца па балотах, за выключэннем канца лета, калі яны высыхаюць».

II.

Цікава, у чым жа трэсліся па тых дарогах вандроўнікі? К таму часу, пра які ідзе гаворка, амаль што адышлі ў нябыт старыя вазы з калёсамі, зробленымі з цэльнага кавалка дрэва (апошнім іх заўважыў, здаецца, англічанін Р. Джонстан). Колы пачалі рабіцца з гнутых абадоў, злучаных спіцамі, зверху акоўвацца жалезам: з жалеза каваліся таксама восі.

Больш разнастайнымі сталі формы павозак. Па-ранейшаму знатныя асобы падарожнічалі карэтамі (кароцамі), запрэжанымі чацвёркай, шасцёркай ці нават васьмёркай коней. Звычайна туды ўмяшчаліся чатыры чалавекі. У XVIII стагоддзі карэты пачалі звонку пакрываць лакам, а ўнутры ўпрыгожваць роспісам і люстэркамі. Больш дэмакратычнымі былі адкрытыя павозкі — брычка, каляска, тарадайка, напаўзакрыты коч. Паступова ўваходзілі ў моду тарантас, у якім кузаў ставіўся на доўгія спружыністыя ліштвы, прымацаваныя да восяў, фаэтон, над якім у дождж можна было нацягнуць будку, рэпрэзентацыйнае ланда (таксама з рассоўнай будкай). Маладыя кавалеры фарсілі ў карыёльках — лёгкіх двухколках, унутры абабітых скурай. З уводам паштовай камунікацыі на дарогах Беларусі з'явіліся першыя дыліжансы і амнібусы, якія ўмяшчалі ўжо да 10—15 чалавек. Адным з такіх амнібусаў, запрэжаным у дванаццаць коней, Маяркевіч ехаў у 1842 годзе з Брэста ў Мінск. Вось-вось па тэрыторыі Беларусі павінны былі пралегчы першыя чыгункі — праз Гродна (1862), Полацк і Віцебск (1866), Мінск (1871).

А пакуль тыя чыгункі, падарожнічалі коньмі. Коні маглі быць сваімі, нанятымі ў прыватных асоб або паштовымі.

Сваімі коньмі ездзілі рэдка і толькі на невялікія адлегласці. Вядома, такое падарожжа абыходзілася дзешавей: паклаў пад сядзенне пару мяшкоў аўса або купіў торбу ў карчмара — і ўсе расходы. Таму сваім коням аддавала перавагу бяднейшая шляхта. Аднак у замежнае падарожжа сваім гнядым ці буланым не паедзеш. Таму іншаземцы звычайна наймалі коней у мясцовых яўрэяў-карчмароў ці татараў. Такім чынам ехалі праз Беларусь У. Кокс, Г. Форстар.

«У Барысаве, — прыгадвае У. Кокс, — яўрэі дасталі для нас дзесяць коней і запрэглі іх у два рады: шэсць коней да экіпажа і чацвёрку на вынас. Патрэбна было вялікае майстэрства, каб так іх прыпрэгчы. Два сярэднія кані задняга раду былі прыпрэжаны, як звычайна, да штэльвагі, два наступныя — да прывязной вагі, што выступала далёка ўбакі за пярэднія колы, а два крайнія пры дапамозе доўгіх вяровак былі такім жа чынам прыпрэжаны да задняй вагі, чатыры вынасныя кані былі прыпрэжаны да дышла і да штэльвагі, прымацаванай да дышла».

Часам коні, прадстаўленыя карчмарамі, былі такія худыя і нягеглыя, што падарожжа ператваралася ў суцэльную пакуту. Зведаў яе і нямецкі прыродазнаўца Г. Форстар. 16 лістапада 1784 года ён дагаварыўся ў Гродна з карчмарамі, што тыя за дзвесце польскіх злотых завязуць яго ў Вільню. Замест а сёмай гадзіны раніцы возчыкі з'явіліся толькі а палавіне дзевятай, а потым яшчэ са дзве гадзіны раманТавалі вупраж. Урэшце адзін карчмар сеў побач са слугой Форстара на казлах, другі ж — ззаду на сенніку. «Хаця яны мелі пяць коней, аднак не ставала сёдлаў, таму коні былі запрэжаны ў адзін рад. Воз амаль не пасоўваўся наперад, бо коні былі не толькі ніжэй за звычайных аслоў, але, звыш таго, такія мізэрныя, змучаныя і пакрытыя каростай, што мая надзея дабрацца з іх дапамогай да Вільні зусім развеялася. Лейцы ўвесь час рваліся, коней перапрагалі, яшчэ не знікла з вачэй Гродна, а ўжо між карчмарамі пачалася калатэча, якая працягвалася праз увесь час нашай супольнай язды. Адзін папракаў другога, што той беражэ свае коні і паганяе коней супольніка». Лаянка часам пераходзіла ў бойку.

За тры з палавінай гадзіны Форстар праехаў усяго каля пятнаццаці кіламетраў. Таму дзесьці ў Ротніцы ён рашыў расстацца з карчмарамі, якія, дарэчы, уцяклі, не вярнуўшы задатку, і далей ехаць паштовымі коньмі; здабыць іх таксама было нялёгка, бо падарожных было многа і кожны з пагрозамі патрабаваў адправіць яго ў першую чаргу.

Але як бы там ні было, падарожнічаць паштовымі коньмі было прасцей і лягчэй, чым наёмнымі. Адкрыццё паштовых трактаў значна ажывіла Беларусь. Першы такі тракт быў пракладзены з Вільні праз Мінск на Маскву яшчэ ў 1717 годзе. У другой палавіне XVIII стагоддзя сетка паштовых станцый значна павялічылася. На кожнай з іх можна было пераначаваць, замяніць коней. Вядома, усё гэта патрабавала вялікіх грошай.

Аб тым, колькі каштавала праехаць поштай праз усю Беларусь, можна скласці ўяўленне, прачытаўшы скрупулёзныя «Запіскі» маскоўскага выдаўца М. Галавіна. На ўсю паездку ў Германію ён затраціў 3 576 рублёў, з іх у Беларусі — 239 рублёў. Зваротны праезд праз Беларусь абышоўся яму ўжо ў 370 рублёў. З чаго ж складаліся гэтыя сумы? Перш за ўсё, з прагонных за коней. Пасля Оршы, жаліўся Галавін, «прагонныя грошы ўзвышаюцца і замест 5 капеек плацілі па 8 капеек на каня» (маецца на ўвазе плата за кожную вярсту). Са Смалявіч да Мінска набіралася 6 рублёў 72 капейкі, з Мінска да Прылук — 5 рублёў 28 капеек. Начлег абыходзіўся ў 1 рубель 47 капеек, «каравульнаму», каб не пакралі рэчаў, — 84 капейкі, ямшчыку «на водку» — да 36 капеек (у залежнасці ад настрою бывала і меней — 12 ці 14 капеек), за пераправу на пароме праз рэчку — 46 капеек. А грошы гэта ўсё былі на той час немалыя. У Мінску Галавін заплаціў за дзесяць фунтаў сала 3 рублі 40 капеек. Фунт важыў каля 400 грамаў... Значыць, кілаграм сала абыходзіўся ў 85 капеек. Дарога са Смалявіч да Мінска каштавала столькі ж, колькі восем кілаграмаў сала... Таму такое падарожжа маглі сабе дазволіць толькі вельмі заможныя людзі. Значную частку дарожных расходаў складала плата за начлег.

III.

Гасцініц у сучасным разуменні яшчэ не было. Праўда, у большых гарадах з'явіліся першыя заезныя дамы (гаспоДы). Але ў гэтых дамах начлежнікі былі пазбаўлены элементарных выгод. Нямецкі вучоны І. Бярнулі па прыездзе ў Гродна занатаваў у сваім дзённіку: «Вялікая і прыгожая гаспода, якую мы здабылі пасля вялікіх цяжкасцей, на першы погляд вока абяцала нам усе зручнасці і магчымасці адпачыць: ды, на жаль, мы аказаліся сярод чатырох свежа пафарбаваных сцен, дзе не было ні ложка, ні крэсла, ні нават падаконніка, на які можна было б што-небудзь пакласці — так, зрэшты, выглядалі ўсе пакоі; не было нават замкоў у дзвярах, акрамя гэтага ўладальнікі заезда (хаця гэта былі немцы) зусім дрэнна кіравалі гасподай. Паколькі якраз выпала нядзеля, шмат галоты сабралася тут, каб пагуляць і патанцаваць, адным словам — не мела сэнсу затрымлівацца тут даўжэй». Зразумела, можна было спыніцца і ў прыватным доме. Але гэта каштавала дорага, асабліва ў час сеймікаў або кірмашоў. Аказаўшыся ў Гродна ў час сейма, немец Ф. Шульц абураўся: «Пакойчык і ложак абыходзіўся ў дзень адзін, два і тры дукаты, а ніштаваты абед — восем да дванаццаці польскіх злотых. Аднаконны воз сена каштаваў тры да чатырох дукатаў».

Заезныя дамы, зразумела, былі далёка не ва ўсіх гарадах. На ўсім шляху з Оршы да Брэста М. Галавін напаткаў толькі адну «гасцініцу» — у Крупках. Начаваць прыходзілася пераважна ў корчмах. Корчмы ж засталіся амаль такія, якімі іх апісалі падарожнікі XVI—XVII стагоддзяў: брудна, холадна, няўтульна, шумна... Вось як, напрыклад, У. Кокс апісваў месца свайго начлегу дзесьці пад Смалявічамі: «Выйшаўшы з экіпажа, мы пабачылі, што знаходзімся ў велізарным гумне ці пад павецю, у супрацьлеглым канцы якой гарэла вогнішча без дымавой трубы; на ім ляжалі дзве сасны з неабсечанымі сукамі; вакол вогнішча стаялі некалькі чалавек у даўгаполым чорным адзенні, з доўгімі бародамі. Яны нешта размешвалі ў вялікім катле, падвешаным над полымем. Калі б мы верылі ў чары або хоць крышку былі забабонныя, то лёгка прынялі б гэтых людзей за ведзьмакоў, што выконваюць нейкі таямнічы абрад».

[Заканчэнне будзе.]

ДЫРЫЖОР ВАЕННАГА АРКЕСТРА

Барысу ПЕНЧУКУ — 60 год

Нядаўна грамадскасць рэспублікі адзначыла 60-годдзе з дня нараджэння і сорак гадоў творчай дзейнасці народнага артыста БССР, галоўнага дырыжора аркестра штаба Чырванасцяжнай Беларускай ваеннай акругі, палкоўніка Барыса Пенчука. У зале Белдзяржфілармоніі адбыўся творчы вечар юбіляра. Зноў перагорнуты старонкі яго біяграфіі — шлях ад чырвонаармейца, саліста духавога аркестра, да народнага артыста БССР.

Барыс Міхайлавіч не ўяўляе жыцця без свайго аркестра. Калектыў ,якім кіруе ён вось ужо больш як пятнаццаць гадоў, заслужаны, узорны. За высокае выканаўчае майстэрства і вялікую работу па эстэтычнаму выхаванню моладзі аркестр і яго кіраўнік у снежні 1972 года былі ўдастоены прэміі Ленінскага камсамола Беларусі.

Як прыемна глядзець на падцягнуты, акуратны, бліскаючы меддзю інструментаў строй духавога аркестра. Ніводнае свята не абыходзіцца без яго ўдзелу. Аркестр суправаджае дэманстрацыі працоўных горада, выступае на ўрачыстасцях, праводзіць святы духавой музыкі, маршы-парады. За пяць апошніх гадоў, напрыклад, з яго творчасцю пазнаёміліся больш за 150 тысяч слухачоў.

— Мы выконваем розныя творы, — гаворыць Барыс Міхайлавіч. — Па-першае, гэта руская і заходняя класіка, музыка савецкіх кампазітараў. Вялікая задача пастаўлена мной перад аркестрам — больш вывучаць і распаўсюджваць творы беларускіх аўтараў. На жаль, для духавога аркестра мала хто піша, даводзіцца самім займацца апрацоўкай, інструментоўкай.

Шмат апрацовак зроблена самім дырыжорам. Гэта спартыўны марш «Біятлон» і песні Ігара Лучанка, «Жартоўная сцэнка» І. Кузняцова, «Беларускі маладзёжны танец», «Канцэртная полька», «Беларуская фантазія» Д. Камінскага, а таксама песні У. Алоўнікава, Ю. Семянякі і іншых аўтараў. Па заказу Саюза кампазітараў рэспублікі Б. Пянчук інструментаваў таксама Дзяржаўны гімн Беларускай ССР. Ёсць у рэпертуары аркестра і ўласныя творы дырыжора — «Марш на тэмы песень У. Алоўнікава», марш «Партызанам Беларусі», «Страявы марш на тэмы песень Ю. Семянякі», «Беларускі камсамольскі марш на тэмы песень І. Лучанка».

Працу за дырыжорскім пультам Б. Пянчук сумяшчае з педагагічнай дзейнасцю ў кансерваторыі. Ён — дацэнт кафедры аркестровага дырыжыравання. Акрамя таго — член рэпертуарнай камісіі Міністэрства культуры БССР, на працягу многіх гадоў з'яўляецца нязменным старшынёй журы аглядаў і конкурсаў духавой музыкі, выдаў кнігу «Дырыжору духавога аркестра».

Але ўсё ж галоўная яго работа — са сваім аркестрам.

— Ведаеце, — расказвае Барыс Міхайлавіч, — наш калектыў абнаўляецца двойчы ў год, калі адны хлопцы заканчваюць службу ў радах Савецкай Арміі, а другія прыходзяць на іх месца. І каб утрымаць творчую аснову калектыву, у нас існуе патрабаванне, што двойчы ў год кожны наш музыкант дае справаздачу па адзіночнай спецыяльнай падрыхтоўцы. У нас шмат добрых выканаўцаў, калі пачаць пералічваць, то прыйшлося б увогуле назваць усіх 50 чалавек.

Нашу размову з Барысам Міхайлавічам час ад часу перапынялі музыканты, якія падыходзілі павіншаваць яго з узнагародай: Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР за шматгадовую плённую працу ў галіне музычнага мастацтва і ў сувязі з 60-годдзем з дня нараджэння народны артыст БССР Б. Пянчук узнагароджаны Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР. А за дзвярыма чуліся гукі духавых інструментаў — музыканты рыхтаваліся да чарговай рэпетыцыі. І я думаў аб тым, што праз некалькі мінут сціхне гэта рознакаляровая какафонія, узляціць уверх дырыжорская папачка — і грымне гучны, бадзёры марш. Бо перад аркестрам зноў стане яго нязменны дырыжор.

А. ЯНДОЎСКІ.

Старэйшы ганчар Івянца Віктар КУЛІКОЎСКІ.

Фота В. ЖДАНОВІЧА.

У гасцях у працаўнікоў племзавода «Леніна» Магілёўскай вобласці артысты Дзяржаўнага народнага аркестра БССР імя Жыновіча.

76 ЛІТАРАТУР НА СТАРОНКАХ «ДРУЖБЫ НАРОДОВ»

— Я не ўяўляю сабе савецкую літаратуру без кіргіза Чынгіза Айтматава, аварца Расула Гамзатава, балкарца Кайсына Куліева, кабардзінца Аліма Кешокава і пісьменнікаў іншых нацыянальнасцей, — гаворыць галоўны рэдактар часопіса «Дружба народов» вядомы савецкі паэт і празаік Сяргей Баруздзін.

Усю шматколернасць 76 савецкіх літаратур можна ўбачыць на старонках гэтага штомесячніка (тыраж больш за 200 тысяч экземпляраў), які быў створан амаль сорак год назад па ініцыятыве класіка рускай савецкай літаратуры Максіма Горкага.

Навошта патрэбен такі часопіс? Па-першае, чытачы, абсалютная большасць якіх валодае рускай мовай, могуць прачытаць творы пісьменніка, мову якога яны не ведаюць. Па-другое, праз рускую мову нацыянальныя літаратуры знаходзяць дарогу і да замежнай аўдыторыі. «На калмыцкай мове, — гаворыць пісьменнік Давід Кугульцінаў, — мяне чытаюць сто тысяч, а на рускай — мільёны савецкіх людзей розных нацыянальнасцей. ...Мы пазнаём свет на рускай мове, і свет пазнае нас таксама на рускай мове».

Трэцяя немалаважная акалічнасць: пісьменнікі ўсіх савецкіх літаратур вучацца адзін у аднаго майстэрству, выкарыстоўваючы ў творчасці дасягненні суседзяў. Так, руская літаратура, на думку Р. Гамзатава, дапамагла яму «пісаць лепш, больш моцна... больш выразна выказваць думкі і пачуцці», пазнаёміла з новымі для аварскай літаратуры жанрамі. У выніку горская паэзія «набыла новыя рысы: яе музычнасць абагацілася моўным жывапісам, уменнем ствараць выразныя, рэалістычныя малюнкі».

Што друкуе часопіс? Паэзію, прозу, публіцыстыку, літаратурную крытыку. Цікава, што пераважная большасць твораў пісьменнікаў, удастоеных вышэйшай у краіне прэміі — Ленінскай, была ўпершыню надрукавана на рускай мове ў часопісе «Дружба народов». Сярод лаўрэатаў, напрыклад, былі ўкраінцы Міхаіл Стэльмах і Алесь Ганчар, Чынгіз Айтматаў і Расул Гамзатаў, беларус Пятрусь Броўка, літовец Понас Авіжус і іншыя.

Прайшоў час, калі многія младапісьменныя літаратуры моцна адставалі па ўзроўню ад тых, што маюць даўнюю гісторыю. «Раней мы перакладалі і друкавалі практычна ўсе колькі-небудзь значныя творы ў той або іншай нацыянальнай літаратуры,— расказвае С. Баруздзін. — І бывала так, што побач з рускай, напрыклад, літаратурай яны моцна прайгравалі ў мастацкіх адносінах. Цяпер у кожнай нацыянальнай літаратуры ёсць нямала твораў, якія могуць стаць з'явай усесаюзнага маштабу».

Больш як 20 год выходзіць дадатак да часопіса (15 тамоў штогод тым жа тыражом, што і часопіс), дзе кожны аўтар выступае ўжо з некалькімі сваімі творамі, якія знайшлі шырокі водгук чытача.

На старонках часопіса, назва якога даволі сімвалічная, і яго дадатку гучыць паліфанія савецкай літаратуры, у якой нацыянальнае і інтэрнацыянальнае цесна звязана паміж сабой.

Таццяна АХЛОМАВА,
Пётр ТАТАУРАЎ.

ЦІ МОЖНА НАВУЧЫЦЬ ПІСЬМЕННІЦТВУ?

У СССР выйшаў першы нумар новага часопіса «Литературная учеба», закліканага дапамагаць пачынаючым літаратарам (тыраж 15 тысяч экземпляраў). Карэспандэнт агенцтва друку «Навіны» ўзяў інтэрв'ю ў галоўнага рэдактара гэтага выдання доктара філалагічных навук, прафесара маскоўскага Літаратурнага інстытута імя Горкага, віцэ-прэзідэнта Міжнароднай асацыяцыі літаратурных крытыкаў **Аляксандра МІХАЙЛАВА.**

— На праходзіўшай нядаўна ў Маскве першай творчай канферэнцыі маладых літаратараў вядомы савецкі пісьменнік Юрый Трыфанаў заявіў: «Як можна навучыць пісьменніцтву?.. Якія практычна могуць быць вучні ў Талстога, Дастаеўскага, Чэхава?... Пісьменніцтва — гэта цяжкая праца ў адзіночку...» Ці згодны вы з гэтым сцверджаннем?

— Не зусім. Вядома, няздатнаму літаратару не могуць дапамагчы ні інстытут, ні «Литературная учеба», ні настаўніцтва вялікага пісьменніка... Вядома, пісьменніцтва — вельмі інтымны працэс, які патрабуе велізарнай сканцэнтраванасці, а значыць — адзіноцтва. Але апошняе правільна, калі гутарка ідзе аб сталым, вядомым майстру.

Маладому ж, неўзмацнеламу таленту неабходна дапамога, каб ён поўнасцю раскрыўся, зразумеў свае магчымасці, адчуў сябе ўпэўненым. Гэтаму садзейнічаюць шматлікія літаратурныя аб'яднанні, нарады і канферэнцыі маладых пісьменнікаў. Гэтую ж мэту мае на ўвазе і новы часопіс. Дарэчы, шмат аб чым гавораць самі назвы яго рубрык: «Прадстаўляем маладых», «Творы маладых аўтараў разбіраюць...», «Слова майстрам», «Метад. Стыль. Паэтыка», «Урокі класікі», «Агляды. Меркаванні. Інфармацыя», «Літаратуразнаўчыя сюжэты»... Мы будзем прыцягваць да супрацоўніцтва лепшых савецкіх пісьменнікаў і паэтаў, якія падзеляцца сваім творчым вопытам, прааналізуюць творы маладых, дадуць ім парады. Часопіс, на нашу думку, павінен стаць галоўнай трыбунай і своеасаблівым «літаратурным універсітэтам» творчай моладзі.

— Але часопіс з назвай «Литературная учеба» ўжо існаваў...

— Сапраўды, у 1930 годзе па ініцыятыве Максіма Горкага стаў выходзіць такі часопіс, «прызначаны ў дапамогу творчай рабоце пачынаючага рабочага і сялянскага пісьменніка». Але ў 1941 годзе ён спыніў сваё існаванне — пачалася Вялікая Айчынная вайна з фашысцкай Германіяй, і было проста не да гэтага...

За прайшоўшыя гады савецкая літаратура вельмі вырасла. Выраслі і пачынаючыя літаратары, яны ўжо не падобныя на рабочых і сельскіх карэспандэнтаў — галоўных чытачоў ранейшай «Литературной учебы», якія мелі часам толькі некалькі класаў пачатковай школы. Творчы ўзровень сённяшняй літаратурнай моладзі дазваляе рэгулярна публікаваць яе прозу, паэзію, публіцыстыку. Дарэчы, мы спадзяёмся, што кола нашых чытачоў не абмяжуецца толькі маладымі пісьменнікамі і часопіс будзе цікавы ўсім аматарам літаратуры.

— Ці існуюць падобныя часопісы за мяжой? І што ўвогуле вы можаце сказаць пра становішча маладога літаратара на Захадзе?

— Падобнага часопіса, ва ўсякім выпадку ў Еўропе, няма. На другое пытанне з упэўненасцю магу адказаць так: у буржуазным грамадстве аб арганізаванай дапамозе маладому літаратару няма чаго і гаварыць. Калі пачынаючы літаратар бедны і ў яго няма заступнікаў, то і пры наяўнасці таленту прабіцца яму надзвычай цяжка. Дарэчы, я збіраюся падняць пытанне аб лёсе творчай моладзі на Захадзе на пасяджэнні Міжнароднай асацыяцыі літаратурных крытыкаў...

Фелікс МЯДЗВЕДЗЕЎ.

ЖЫЦЦЯ САПРАЎДНАЯ ЦАНА

Сённяшняе, так званае сярэдняе паэтычнае пакаленне беларускай літаратуры вельмі значнае і па колькасці імён, і па рознасці творчых почыркаў асобных аўтараў, адметнасці іх пісьма. Сярод прадстаўнікоў яго такія яркія індывідуальнасці, самабытныя майстры слова, як Рыгор Барадулін і Анатоль Вярцінскі, Ніл Гілевіч і Генадзь Кляўко, Пятрусь Макаль і Данута Бічэль-Загнетава... Адно з першых месц у спісе гэтым займае лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі Генадзь Бураўкін, паэт акрэсленага публіцыстычнага кірунку, які адначасова можа быць і задушэўным лірыкам, чуйным і ўважлівым да самых тонкіх выяўленняў чалавечай душы.

Як і большасць яго равеснікаў, Г. Бураўкін у літаратуру прыйшоў студэнтам. Праўда, вершы пісаць ён пачаў яшчэ ў школьным узросце, аднак толькі пад час вучобы на аддзяленні журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна стаў рэгулярна друкавацца на старонках рэспубліканскіх газет і часопісаў. Менавіта тады, у сярэдзіне пяцідзесятых гадоў, калі паэтычны працэс актывізаваўся наогул, маладыя аўтары сталі ўважліва прыглядацца да паўсядзённых працэсаў і з'яў жыцця, выказваць свае актыўныя адносіны да іх.

У адным з ранніх вершаў, які крыху пазней увайшоў у яго першую кнігу «Майская просінь», Генадзь Бураўкін дакладна вызначыў сваю грамадзянскую пазіцыю:

Я з твайго неспакойнага
племені,
Партыя,
Хоць ля сэрца білет твой
яшчэ не нашу.
Гэта ты разам з маці дала
мне ўпартую
І няўрымслівую душу.

Потым былі кнігі «З любоўю і нянавісцю зямною», «Дыханне», «Жніво», «Выток». Сёлета ў рэспубліканскім выдавецтве «Мастацкая літаратура» выходзіць чарговы паэтычны зборнік Г. Бураўкіна «Варта вернасці». Многія вершы паэта ледзь не адразу сталі хрэстаматыйнымі.

Адметнасць таленту паэта (а ён вядомы яшчэ і як празаік, і як дзіцячы пісьменнік) у надзвычайнай шчырасці і адкрытасці, у той даверлівасці, якая дазваляе выносіць на суд людскі самае запаветнае і дарагое. Не выпадкова ў аўтабіяграфіі, напісанай яшчэ гадоў пятнаццаць назад, знаходзіш і такія радкі: «Літаратуру, паэзію я люблю даўно і верна — і гэта не выхваленне. Я проста не ўяўляю сабе жыцця без слова Лермантава і Купалы, Маякоўскага і Багдановіча. Я ненавіджу — як здраду, як чалавечую подласць і беспрынцыпнасць — халтуршчыкаў і «калялітаратуршчыкаў» і падзіцячы закаханы ў тых, хто ведае, беражэ і песціць роднае слова».

Што радасці маёй выток,
Выток натхнення
і гарэння! —
З крыніцы полацкай
глыток,
З лясоў, з-пад самага
карэння,
Ці зорных караблёў віток
Над светам, поўным
захаплення,
Ці ленінскіх сцягоў паток
Пад майскім ветрам
абнаўлення!

Своеасаблівым адказам на падобныя пытанні і з'явіўся творчы вечар паэта, што адбыўся нядаўна ў Доме літаратара ў Мінску. Адкрыў яго народны паэт Беларусі П. Панчанка. «У паэзіі, — сказаў ён, —ёсць вечныя тэмы: нараджэнне і смерць, любоў і нянавісць, праца, змаганне, адданасць Радзіме. І кожны сапраўдны паэт, раскрываючы іх, прыносіць музыку і рытм свайго часу. Такім паэтам і з'яўляецца Генадзь Бураўкін». А потым выступіў сам віноўнік урачыстасці і прачытаў свой верш «Выток»:

Пяю, як трапяткі лісток
На дрэве вернасці высокім.
І хочацца, каб мой радок
Стаў нейчай радасці
вытокам...

Радкі яго, то мужныя, гнеўныя, як у паэме «Хатынскі снег», то засяроджана-лірычныя ў вершах пра каханне, то сардэчныя, па-сыноўскаму разважлівыя, глыбокія па думцы, шчырыя па пачуццю ў творах, прысвечаных роднай Беларусі, гучалі ў выкананні артыстаў мінскіх тэатраў і Белдзяржфілармоніі, пераклікаліся з песнямі, напісанымі на словы паэта Ю. Семянякам, І. Лучанком, С. Картэсам, Г. Вагнерам.

Адна з іх — «Удзячны лёсу...».

Я ўдзячны лёсу, што з ўсіх
краёў
Ён выбраў для мяне навекі
гэты,
Дзе бальшакі прастуюць
між гаёў,
А па сцяжынках коцяцца
ранеты,
Дзе Нарач мые сінія шаўкі
І п'юць з Дняпра
паўдзённыя вясёлкі,
Дзе з салаўямі дражняцца
шпакі
І жыту голас дораць
перапёлкі.

Еднасць з бацькоўскай зямлёй, разуменне яе непаўторнага хараства адчуваецца ў многіх творах Г. Бураўкіна. Аднак паэт не паўтараецца, бо кожны раз знаходзіць усё новыя і новыя фарбы, каб перадаць сваё замілаванне Радзімай і яе людзьмі. На вечары шмат гучала вершаў, якія ўспрымаюцца своеасаблівай сацыяльна-грамадскай і маральна-этычнай праграмай усяго пакалення, да якога належыць аўтар.

Значным дасягненнем не толькі Г. Бураўкіна, але і ўсёй беларускай паэзіі стала яго паэма «Ленін думае пра Беларусь» —твор, які падагульніў пэўны этап у творчасці паэта, засведчыў аб тым, што ягоная сталасць дасягнула яшчэ адной значнай вяршыні, з якой не толькі вельмі добра бачыцца здзейсненае, але і выразна відаць новыя далягляды.

Паэт прачытаў урыўкі з гэтага твора, а таксама некаторыя вершы, напісаныя раней, і тыя, што ўвайшлі ў новую кнігу «Варта вернасці». Як прызнанне і споведзь гучалі радкі:

...Я на лёс не наракаю.
Я ладзіў шлях жыццёвы
свой
Сваімі ўласнымі рукамі,
Сваёю ўласнай галавой.
А што спазнаў і роспач
бедаў
І горкі прысмак палыну, —
Дык для таго,
каб добра ведаў
Жыцця сапраўдную цану.

...Сапраўдную цану жыцця ён вывучае не па кнігах. Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі, дэлегат чатырох з'ездаў ВЛКСМ, член бюро ЦК ЛКСМБ, галоўны рэдактар рэспубліканскага маладзёжнага часопіса «Маладосць», Г. Бураўкін у складзе дэлегацыі БССР удзельнічаў у рабоце XXXI сесіі Генеральнай Асамблеі ААН, рэгулярна выязджае ў калгасы і саўгасы, наведвае прадпрыемствы. Усё гэта дае яму натхненне для новых твораў, служыць самасцвярджэнню таленту яркага і самабытнага.

Алесь МАРЦІНОВІЧ.

НОВЫЯ ВЕРШЫ

Кастусь КІРЭЕНКА

ГУСІ

Ляцелі гусі.
Са здалёк, відаць, ляцелі —
І стаміліся, напэўна.
І селі гусі
Каля нашай хаты
На асеннюю раллю.
А тады апала шэрань.
І набраклыя
скавала птахам крылы.

І яны,
Калі адчулі,
Што ў палёт ім больш
не ўзняцца,
Закрычалі
На ўвесь цэлы свет вялікі
пра сваю бяду.

Гусі, гусі!..
Я пачуў іх
І збянтэжаны прыбег у нашу
хату,
І знямелы я застыў перад
табою,
І адно вачмі
табе паказваў у акно.

І тады
наўздзіў спакойна, ціха
Ты ўзяла сваю паркалевую
хустку
І пайшла —
Як да дзяцей сваіх маленькіх,
На раллю
да тых спалоханых
гусей.

Ты прыйшла да іх —
Звычайна, рупна, проста.
Так звычайна,
Быццам так было штодня,
заўсёды.
І спакойна
Ты за птушкай птушку брала
Ў свае рукі,
І спакойна абцірала
Шэрань ліпкую
з іх крылаў і з іх ног.

І даверліва з табою
Гусі-лебедзі пра нешта
гаварылі,
І шчаслівыя ўзніміаліся
на крылы,
І ляцелі—паляцелі твае гусі
Ў свет вялікі,
пакружыўшы над табой...

З той пары—
Што ні адбудзецца ў жыцці —
я ўспамінаю
З верай, з яснаю надзеяй
тую восень,
І раллю, і развітальны крык
гусей.

З той пары—
Як толькі цяжка мне бывае —
Падыходжу да цябе, ускідаю
рукі
І чакаю —
каб сваімі дарагімі,
Дарагімі мне давеку і святымі
Дакранулася рупліва ты да іх...
Ці пяшчотна,
з ласкай матчынай,
паклала
Свае праведныя рукі
На маё плячо...

* * *

«Што мінула цяжкое —
няхай яно больш
не вернецца!..»—
Любая мама,
бяру твае словы ў верш.
У добрае, мама,
заўсёды верыцца,
Таму і жывеш толькі,
што ў добрае верыш.
Якая гэта радасць, мама,
што ты да мяне прыехала.
Ад краю маленства.
Ад роднага дзіва-святла.
Лясоў і лугоў
успамінам-рэхам
Усю душу абдала.
Сядзь побач. Усміхніся.
Не хачу бачыць тваёй
слязы.
Будзь заўсёды
маіх трывог абаронцай.
А раніцай —
будзі мяне, як калісьці:
— Вот вазьму матузы.
Дык адразу прачнешся,
убачыш,
што ўзышло сонца!..

прэм'еры, выстаўкі, сустрэчы

ПЕСНІ ПАРТЫЗАН

Настаўнік — пенсіянер Верамеейскай сярэдняй школы, што на Магілёўшчыне, Андрэй Палякоў скончыў работу па збору песень, якія ў дні Вялікай Айчыннай вайны складалі партызаны дзейнічаўшага тады на Магілёўшчыне праслаўленага палка пад камандаваннем Героя Савецкага Саюза Грышына. А. Палякоў, былы палітрук аднаго з батальёнаў гэтага палка, сабраў чатырнаццаць песень, створаных партызанскім паэтам Маркам Максімавым і іншымі аўтарамі.

У ГОСЦІ ДА ВАЛЖАН

П'есай І. Шамякіна «І змоўклі птушкі...» адкрыў гастролі ў Сызрані Бабруйскі абласны тэатр драмы і камедыі імя В. Дуніна-Марцінкевіча. У гастрольнай афішы — творы класікі, сучасных савецкіх і зарубежных аўтараў, п'есы беларускіх драматургаў.

Калектыў выступіць таксама ў Тальяці, сустрэнецца з рабочымі прамысловых прадпрыемстваў і сельскімі працаўнікамі.

ДАРОГІ ТВОРЧАСЦІ

У выдавецтве «Советский композитор» у Маскве выйшла кніга Л. Аўэрбаха «Беларускія кампазітары». Яна прысвечана творчасці Я. Глебава, С. Картэса, І. Лучанка, Д. Смольскага.

ПЕСНІ МАСКВІЧОЎ

Цёпла прымалі гамяльчане саліста Масканцэрта лаўрэата ўсесаюзнага і міжнародных конкурсаў Уладзіміра Макарава і вакальна-інструментальны ансамбль «Арбіта». У канцэртах гучалі песні савецкіх кампазітараў і мелодыі замежных аўтараў.

Артысты выехалі ў гастрольную паездку па гарадах Гомельскай вобласці.

У ПОЛЬШЧУ З КАНЦЭРТАМ

Лаўрэат Усесаюзнага фестывалю самадзейнай мастацкай творчасці працоўных танцавальны ансамбль калгаса імя Гастэлы Мінскага раёна рыхтуе новую праграму. Асобныя нумары яе будуць выкананы ў канцэртах, якія пройдуць у Польскай Народнай Рэспубліцы.

ГАДАВІНА КЛУБА

Мінскі джаз-клуб адзначыў першую гадавіну свайго існавання. У створаным аматарамі джаза клубе людзі розных узростаў і прафесій—студэнты, рабочыя, інжынеры, урачы, музыканты. Тут можна пазнаёміцца з гісторыяй джаза, даведацца пра апошнія навінкі джазавай музыкі ў краіне і за мяжой, паслухаць магнітафонныя запісы, сустрэцца з музыкантамі-гастралёрамі.

ПРЭМІЯ КІНАФІЛЬМУ

Закончыў работу XI Усесаюзны кінафестываль. Дэманстравалася звыш ста фільмаў розных жанраў. Па раздзелу дакументальных фільмаў адзначана беларуская карціна «Днём і ноччу». Яна ўзнагароджана прызам імя Р. Кармэна.

ЮБІЛЕЙ ПІСЬМЕННІКА

У гонар 95-годдзя з дня нараджэння вядомага дзіцячага беларускага пісьменніка, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР Янкі Маўра ў Мінскай дзіцячай абласной бібліятэцы, якая носіць яго імя, адбылася сустрэча юных чытачоў з пісьменнікамі Беларусі і блізкімі юбіляра. Падобныя сустрэчы прайшлі ва ўсіх школах і бібліятэках рэспублікі.

БЕЛАРУСКІЯ ЭКСЛІБРЫСЫ

Ва Ульянаўску, на пастаянна дзеючай выстаўцы экслібрысаў, адкрылася экспазіцыя работ мінскага мастака Я. Ціхановіча. Іх прадстаўлена больш за сто. Работы прысвечаны рускім і савецкім пісьменнікам, героям рускіх і беларускіх казак.

Спектаклем «Сымон-музыка» паводле аднайменнай паэмы Я. Коласа пачаў гастролі ў Мінску Віцебскі абласны драматычны тэатр, якому летась было нададзена званне акадэмічнага.

НА ЗДЫМКУ: у ролі Сымона-музыкі — артыст С. ШУЛЬГА.

Вобраз сучасніка — галоўная тэма ў творчасці маладога віцебскага мастака Мікалая ДУНДЗІНА. Ён — удзельнік шэрагу абласных і рэспубліканскіх мастацкіх выставак. Шасцідзесяцігоддзю Ленінскага камсамола прысвяціў жывапісец свае новыя работы — карціну аб чылійскім патрыёце, спеваку і паэце Віктары Хары і палатно аб селькоры-камсамольцы 20-х гадоў, які загінуў ад кулацкай кулі. Цяпер М. Дундзін захоплена працуе над партрэтамі маладых рабочых Беларускага шыннага камбіната.

НА ЗДЫМКУ: Мікалай ДУНДЗІН у майстэрні.

АНТАЛОГІЯ БРАТЭРСТВА

Выдавецтва «Каменяр» у Львове выпусціла кнігу на ўкраінскай мове «Мы сэрцам адзіны». Гэта паэтычная анталогія, на старонках якой сышліся 135 паэтаў братніх рэспублік. Кожны аўтар прадстаўлены адным вершам, перакладзеным на ўкраінскую мову. У кнізе змешчаны і творы трынаццаці вядомых беларускіх паэтаў.

НА АРЭНЕ КЛОУНЫ, ГІМНАСТЫ...



Культурнае жыццё Гомеля сёння нельга ўявіць без цырка. Вялікая яго папулярнасць сярод жыхароў горада. Кожны вечар сюды імкнуцца аматары цыркавога мастацтва самых розных узростаў, каб сустрэцца з майстрамі арэны — акрабатамі і жанглёрамі, гімнастамі і дрэсіроўшчыкамі. І сённяшняя праграма насычана маляўнічымі, запамінальнымі выступленнямі. Акрабаты-вальтыжоры пад кіраўніцтвам В. Маркава ўражваюць сілай і спрытам. Нібы жартуючы, з незвычайнай лёгкасцю выконвае складаную праграму жанглёр Віктар Васільеў. Як зачараваныя, глядзяць і слухаюць гледачы выступленне скрыпача-віртуоза Кастэла Ферара, які іграе на скрыпцы пры самых нечаканых становішчах інструмента.

Замірае зала, калі лёгка і грацыёзна працуе з ільвамі самая маладая савецкая дрэсіроўшчыца драпежнікаў Вольга Барысава.

А які цырк без клоунаў! Гэта іх мастацтва, смешнае і сумнае, якое выяўляе недахопы і сцвярджае дабро, заўсёды з ажыўленнем сустракаецца гледачамі. І папулярныя клоуны Ленінградскага цырка, лаўрэаты міжнародных конкурсаў Анатоль Векшын і Канстанцін Васільеў не даюць сумаваць гледачам ні мінуты.

...Пусцее арэна, гаснуць пражэктары. І заўсёды крыху сумна расставацца з цікавым светам дужых, спрытных, смелых. Да новай сустрэчы, цырк!

Я. КАЗЮЛЯ.

НА ЗДЫМКАХ: выступае дрэсіроўшчыца львоў Вольга БАРЫСАВА; клоуны Анатоль ВЕКШЫН і Канстанцін ВАСІЛЬЕЎ; акрабаты Ірына ПЯТРОВА і Алік ДЗУЦАЎ.

Фота аўтара.

З кніжнай паліцы

БЕЛАРУСКАЕ АБАРОНЧАЕ ДОЙЛІДСТВА

Бібліяграфія па гісторыі архітэктуры папоўнілася яшчэ адным цікавым выданнем — даследаваннем кандыдата гістарычных навук М. Ткачова «Замкі Беларусі (XIII — XVII ст. ст.)». Як відаць з назвы, кніга прысвечана вельмі цікавай галіне беларускай архітэктуры — будаўніцтву абарончых цытадэляў.

Чым жа выклікана актуальнасць тэмы, у чым яе значэнне для гісторыі? Справа ў тым, што ў далёкія і неспакойныя часы сярэдневякоўя тэрыторыя Беларусі не раз станавілася арэнай крывапралітных бітваў, у якіх вырашаліся не толькі стратэгічныя задачы той ці іншай арміі, але і лёс самога беларускага народа, яго права на існаванне і незалежнасць. З гэтай прычыны вынікала патрэба ў стварэнні моцнай сістэмы фартыфікацый, якая б здолела супрацьстаяць самай перадавой у тыя часы тактыцы аблогі і штурму. Кожны горад, манастыр, асобныя жылыя, грамадскія, культавыя збудаванні набылі крапасны характар. З другога боку, працэс развіцця феадальнага ладу абвастрыў антаганістычныя супярэчнасці паміж рознымі класамі і сацыяльнымі слаямі грамадства. Баючыся ўзброеных выступленняў народных мас, якія асабліва ўзмацніліся ў канцы XVI — XVII стагоддзяў, свецкая і духоўная арыстакратыя была вымушана хавацца за замкавымі сценамі. Такім чынам, будаўніцтва абарончых умацаванняў было спецыфічнай для гісторыі беларускага феадальнага грамадства з'явай; у ім адлюстраваліся важнейшыя напрамкі развіцця архітэктуры Беларусі. Выконваючы чыста функцыянальныя задачы, замкі і іншыя абарончыя збудаванні ўвасобілі і эстэтычны светапогляд эпохі, яе важнейшыя мастацкія кірункі.

Як сведчаць археалагічныя даследаванні, да сярэдзіны XIII стагоддзя ўмацаванні нават буйных гарадоў (Полацк, Віцебск, Гродна) былі драўлянымі, хоць і вялося мураванае культавае будаўніцтва. Аднак у XIII стагоддзі, у сувязі з нашэсцямі татара-манголь-скіх полчышчаў і крыжакоў, паўстала неабходнасць стварэння больш трывалых фартыфікацыйных сістэм. У выніку гэтага ў цэнтры драўляных замкаў сталі ўзводзіць мураваныя вежы, якія добра ахоўвалі абаронцаў ад асаднай тэхнікі ворага. Адна з такіх веж, пабудаваная ў 1276—1288 гадах, захавалася ў Камянцы. У архітэктуры помніка вызначыліся новыя для тагачаснага беларускага дойлідства рысы гатычнага стылю. У далейшым з цэглы і каменя ўзводзіліся і абарончыя сцены, таму вежы часта будаваліся не пасярод дзядзінца, а пры сценах замкаў. Відаць, гэта выклікала і змены формы веж: яны рабіліся не круглымі, а ў выглядзе чацверыкоў або васьмерыкоў з высокімі шатровымі дахамі, што, верагодна, звязана з уплывам драўлянага будаўніцтва. У больш ранніх замках (напрыклад, у Лідзе) вежы не вылучаліся са сцен. Паступова яны выйшлі за грані сцен і сталі фланкуючымі элементамі, што ў значнай меры павысіла абараназдольнасць цытадэляў (Крэва, Навагрудак).

Далейшы крок у сваім развіцці зрабілі прыватнаўласніцкія замкі XV—XVI стагоддзяў, у якіх, разам з абарончымі, пераважалі жылыя і гаспадарчыя функцыі. Характэрнымі прыкладамі такіх комплексаў з'яўляюцца Стары замак у Гродна часоў караля Стэфана Баторыя і замак у Міры. Уласна кажучы, гэта ўжо не столькі абарончыя цытадэлі, колькі буйныя палацавыя збудаванні з вялікай колькасцю парадных і жылых памяшканняў. Змена іх функцыянальнага прызначэння адлюстравалася і ў самой архітэктуры помнікаў. Напрыклад, у вядомым далёка за межамі рэспублікі замку ў Міры (XVI стагоддзе) ужо няма суровых і аскетычных форм готыкі XIII — XV стагоддзяў, а адчуваецца наступленне новых прынцыпаў стылю рэнесансу, аб чым сведчыць вельмі ўрачыстая свецкая архітэктура веж, сцен і жылога будынка. Тут ужыты спецыфічны для беларускага сярэдневяковага дойлідства дэкаратыўны прыём, заснаваны на чаргаванні атынкаваных вапнай розных па велічыні і форме нішаў у чырвонай цаглянай сцяне. Нарэшце, вяршыняй развіцця замкавай архітэктуры стаў нясвіжскі комплекс, закладзены ў канцы XVI стагоддзя вядомым італьянскім архітэктарам Я. Бернардоні, а ў XVII—XVIII стагоддзях пераўтвораны ў багаты замкава-палацавы і садова-паркавы ансамбль стылю барока. І сёння замак у Нясвіжы здзіўляе гледача сваёй прыгажосцю, дасканаласцю прыёмаў і форм, гармоніяй з прыродным ландшафтам.

Такім уяўляецца ў агульных рысах шлях развіцця замкавага будаўніцтва ад чыста абарончых комплексаў да палацавых ансамбляў. Аднак аўтар не абмяжоўваецца аналізам толькі замкаў, а дадае таксама вельмі цікавы матэрыял па абарончых («інкастэляваных») храмах. Акрамя вядомых яшчэ ў даследаваннях пачатку нашага стагоддзя цэркваў абарончага тыпу ў Сынковічах, Маламажэйкаве і Супраслі, аўтар прыводзіць даныя і па многіх іншых збудаваннях. Напрыклад, вельмі цікава даведацца, што адной з першых культавых пабудоў, якія набылі абарончыя вежы, стала на рубяжы XV—XVI стагоддзяў вядомая полацкая Сафія. Як слушна заўважае даследчык, такі тып храма — «вынік развіцця своеасаблівага архітэктурнага стылю беларускай готыкі, яркі ўзор сінтэтычнасці і арганічнасці стылю, які ўдала спалучыў усе папярэднія дасягненні мясцовай грамадзянскай і ваеннай архітэктуры».

Такім чынам, у сціслай, але змястоўнай рабоце М. Ткачова прыведзены вельмі цікавы і вялікі па аб'ёму матэрыял да гісторыі беларускага абарончага дойлідства. Багатая ілюстрацыйная падборка, куды ўваходзяць сучасныя і архіўныя фотаздымкі, чарцяжы, малюнкі, рэканструкцыйныя схемы. У дадатку прыведзены спіс помнікаў ваеннага дойлідства Беларусі IX—XVIII стагоддзяў, тэрміналагічны слоўнік і бібліяграфія.

Юрый ЯКІМОВІЧ.

Спорт

ПОСПЕХ БАРЦОЎ

Чатыры дні ў алімпійскім лагеры «Стайкі» ля Мінска праходзіла першынство барцоў-«класікаў» прафсаюзных спартыўных таварыстваў краіны. Больш за дзвесце спартсменаў вялі спрэчку за пуцёўкі на асабісты чэмпіянат краіны.

Сярод пераможцаў турніра мінчанін Мікалай Соцкі. У лік прызёраў трапілі два беларускія барцы — А. Сазонаў з Гродна і В. Ложкін з Мінска.

ПЕРАМАГЛІ МІНЧАНЕ

На шасейных трасах пад Мінскам мацнейшыя веласіпедысты рэспублікі ўдзельнічалі ў традыцыйных спаборніцтвах, прысвечаных памяці заслужанага майстра спорту Б. Балышакова.

Праведзены дзве групавыя гонкі: юніёраў — на 80 і мужчын — на 150 кіламетраў.

Перамаглі мінчане Віктар Малчанаў і Мікалай Цімафееў.

ВЫДАДЗЕНА Ў ТОКІО

Выдавецтва «Беларусь» выпусціла кнігу заслужанага трэнера БССР В. Сянько і В. Палубінскага «Барацьба самба».

Ёю зацікавіліся і японскія спецыялісты. Нядаўна кніга была выдадзена ў Токіо на японскай мове.

ДАКЛАДНА Ў ЦЭЛЬ

Скончыліся спаборніцтвы стралкоў па праграме III Усесаюзных сельскіх спартыўных гульняў у Львове. У стральбе са стандартнага пісталета па круглай мішэні перамог студэнт Беларускага інстытута механізацыі сельскай гаспадаркі Анатоль Друшчыц.

На чэмпіянаце СССР па мастацкай гімнастыцы зборная каманда БССР заняла трэцяе месца. Мінчанка Галіна КРЫЛЕНКА заваявала залаты медаль у практыкаванні з булавамі.

НА ЗДЫМКУ: чэмпіёнка раздае аўтографы.

Фота Р. КРАКАВА.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ

НАШ АДРАС:

МІНСК-ГСП, ЛЕНІНСКІ ПРАСПЕКТ, 44.

ТЭЛЕФОНЫ: 33-01-97, 33-02-80, 33-03-15, 33-16-56, 33-07-82.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

Зак. 912